PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://republika.pl/niva_bielastok/
niva_bielastok@poczta.onet.pl
niva_bielastok@skrzynka.pl

№ 44 (2425) Год XLVII | Беласток, 3 лістапада 2002 г. | Цана 2,00 зл.

Люду змаганне за ўладу

Яўген Мірановіч

Тыдзень да выбараў у органы самакіравання выбарчая кампанія як бы патраціла сэнс. У цэнтры горада вісялі дзесяткі тысяч партрэтаў прэзідэнта горада Рышарда Тура. Па вуліцы Варшаўскай у адным месцы налічыў я 57 плакатаў мясцовага царыка. Нават у Беларусі падчас прэзідэнцкіх выбараў не было так інтэнсіўнай рэкламы пануючага чыноўніка. Гэта адзін з кандыдатаў правага і каталіцкага лагера. Вялікія стэнды рэкламавалі надта пажылога яго галоўнага канкурэнта ад Саюза левых дэмакратаў, Збігнева Пухальскага. Вазілі гіганцкіх памераў яго партрэт на перасоўнай платформе і часам складвалася ўражанне, што гэта інфармацыя пра развітальную сустрэчу з вядомым прафесарам медычных навук. Іншых кандыдатаў на пост прэзідэнта таксама можна было пабачыць на рэкламных стэндах і сценах будынкаў, аднак аставаліся яны ў цяні прапаганды палітычных гігантаў.

Паштовыя скрынкі ледзь умяшчалі выбарчую літаратуру розных камітэтаў, а сметнікі хутка запаўняліся каляровай паперай. Партрэты кандыдатаў на прэзідэнтаў і радных ляжалі таксама на тратуарах. Некаторыя гараджане з садысцкай прыемнасцю тапталі выявы прадстаўнікоў беластоцкай палітычнай эліты. Змест выбарчай прапаганды быў такі нудны, што не хацелася нават чытаць да канца ўсіх абяцанак будучых дэпутатаў. Кандыдаты абяцалі, здаецца, усё, што толькі можна прыдумаць, а люд на вуліцы ці ў краме каментаваў: „Усе яны такія самыя, абы толькі дарвацца да грошай".

На вёсках таксама ішло змаганне за ўладу. У маіх Алексічах сцяна хлява насупраць аўтобуснага прыпынка зіхацела каляровай рэкламай кандыдатаў у гміну, павет і ваяводства. На сцяне яшчэ вісіць прапаганда з мінулагодняй парламенцкай кампаніі. Усе змагаюцца тут за галасы 2-3 выбаршчыкаў. Чатыры гады таму ў самаўрадавых выбарах прымаў удзел толькі адзін жыхар вёскі, у парламенцкіх — трох. „А хто іх бачыў праз гэтыя чатыры гады. Што яны зрабілі для нас", — апраўдваюць сваю пасіўнасць людзі.

У царкве ў дадатак да свечкі ўручылі мне рэкламную лістоўку таварыша ад Саюза левых дэмакратаў. Пры канцы багаслужбы святар заявіў, што мае абавязак паінфармаваць пра кандыдатаў гэтай партыі, якіх падтрымоўвае Праваслаўная царква. Двух з трох прадстаўленых кандыдатаў Царквы гэта ўжо легенда рэвалюцыйнага руху на Беласточчыне. Сапраўдныя цёткі рэвалюцыі, якія за шчасце тутэйшага пра-

[працяг ☞ 2]

Фота ПАЎЛІНЫ ШАФРАН

Вольга Калейнік — Гран-пры Фестывалю

Бардаўская восень 2002

Дзевяты раз у Бельску-Падляшскім прайшоў Фестываль беларускай бардаўскай ды аўтарскай песні. Мерапрыемства, якога галоўным арганізатарам і ініцыятарам з'яўляецца Звяз беларускай моладзі, адбылося 18 і 19 кастрычніка ў Бельскім доме культуры.

У конкурснай частцы прынялі ўдзел васьмёра салістаў з Мінска, Маладзечна і Гродна. Адзіным прадстаўніком Падляшша быў вучань IV класа Бельскага белліцэя Тамаш Суліма, выступленне якога спадабалася бельскай публіцы, хаця потым некаторыя слухачы прызнаваліся, што бурныя апладысменты былі знакам „салідарнасці" з сябрам-ліцэістам.

Камісія, якую састаўлялі трое мінскіх музыкаў Алесь Камоцкі, Аляксандр Памідораў і Міхась Анемпандыстаў, не мела вялікага клопату з прызначэннем узнагарод. Гран-пры IX фестывалю „Бардаўская восень" атрымала маладая мінчанка Вольга Калейнік, якая выспявала ўзнагароду бурмістра Бельска-Падляшскага. Узнагарода, на якой найбольш залежыла ўдзельнікам, самая прэстыжная — магчымасць запісання сваіх твораў у прафесійнай студыі Радыё Беласток, прыпала самому Тамашу Суліму. Бельскае беларускае асяроддзе сваю ўзнагароду прызначыла мінскаму дуэту Алесю Дудко і Дзянісу Лісейчыкаву.

Уладзімір Міхноўскі, першы з выступаючых, 22-гадовы жыхар Гродна, праспяваў дзве песні на свае словы і адну на словы Анатоля Сыса. Здзіўленне публікі выклікаў факт, што паміж песнямі не было перапынкаў. У. Міхноўскі пераходзіў з адной песні ў другую, змяняючы толькі напружанасць гукаў і тэматыку. Было гэта мэтанакіраванае дзеянне, бо, як сам гаворыць, „выбраныя на фестываль творы аб'яднаны адной мэтай — чалавека, які мае амбіцыі, мэты перад сабоюй, і ўсё гэта напамінае трылогію".

Трапіць у Бельск таксама не было проста, — успамінае У. Міхноўскі. — Трэба было перайсці адборачны конкурс у Мінску. Прымала ў ім удзел 20 чалавек, з якіх выбраных было 7 асоб, якія прыехалі на Фестываль.

Лявон Тышкевіч з Маладзечна ўжо няраз выступаў на сцэне, але, як гаварыў пазней, ніколі не адчуваў так вялікага хвалявання, як перад бельскай публікай. Песні, якія прадставіў слухачам, усе на яго словы, падымалі праблему блізкую сэрцу ўсім людзям. Меланхалічная „Восень скрыпача", хрысціянская „Ля крыжа" і патрыятычна-мартыралагічная „Курапаты" спадабаліся слухачам.

Суботні вечар поўніўся сюрпрызамі. На сцэне Дома культуры выступілі Эдуард Акулін і Дзіма Вайцюшкевіч з музычным праектам „В. З. Аркестра". Цудоўна — гэта замалое слова, каб акрэсліць як выступалі прафесіяналы, бо найлепшай ацэнкай былі гарачыя апладысменты і выкліканне бардаў на біс.

У нядзелю выступіла „Эйфарыя" з Нарвы, пераможца з мінулага года, Піт Паўлаў з гурту „Н.Р.М.", Андрэй Мельнікаў — лаўрэат „Бардаўскай восені" 1997 года і Дзіма Вайцюшкевіч.

Каб слухаць беларускую музыку не толькі ў часе фестываляў, бялышчане мелі магчымасць набыць касеты і кампакт-дыскі. На жаль, трэба ўспомніць, што ў гэтым годзе, па прычыне выбараў, усе плакаты з інфармацыяй пра „Бардаўскую восень" былі адразу заклеены палітычнымі плакатамі правай „Еднасці", і пасля аднаго дня пласт наклеєных выбарчых плакатаў дасягнуў 3-сантыметравай таўшчыні, што і абмежавала даступнасць інфармацыі. Можа ў наступным годзе будзе лепш? Маю тут на ўвазе як конкурс, так і інфармацыю пра яго.

Паўліна Шафран

Сваякі на мяжы ☞ 3

Заява набору службоўцаў з ліку мясцовых жыхароў абнадзеіла ўлады Міхалова і шмат якіх маладых, у якіх малыя магчымасці знайсці якую-небудзь працу на тэрыторыі свае гміны. „У гэты момант атрымалі працу на пагранзаставе шэсць цывільных асоб. Нашы людзі займаліся таксама пры яе пабудове і дарожных работах", — прызнаўся міхалоўскі войт.

Доктар У. Манцюк ☞ 3

Бывала, што для асісціравання ў час аперацыі я быў вымушаны браць медсясцёр, бо не было лекара... З ходам часу маладыя сябры вывучыліся і праца аблегчылася. Пад маім кіраўніцтвам семярых лекараў атрымала першую ступень спецыялізацыі, а траіх — другую.

Мікола Давідзюк у Арасе ☞ 5

Мастак Мікола Давідзюк, прафесар Акадэміі выяўленчага мастацтва ў Лодзі, у сваім творчым жыцці ўдзельнічаў у каля трыццаці калектыўных выстаўках у краінах Еўропы. Першая яго персанальная выстаўка ў Францыі адбылася ў днях 7-21 верасня ў горадзе Арас. Экспанавался каля 15 карцін з выявамі чалавечых твараў.

Паэтычнае Трохгалоссе ☞ 8

Рэпертуар удзельнікаў быў розны і некаторыя з твораў выклікалі цяжкасці. Бжэхва, Каханоўскі, Аснык, Тувім, Міцкевіч — гэта найбольш папулярныя польскія паэты. З беларускіх цікавасцю дэкламатараў карысталіся творы Максіма Багдановіча і Віктара Шведа.

Вера Касмовіч з Гарадзеі ☞ 9

Вера Касмовіч (з дому Скачко) нарадзілася ў 1928 г. У 1942 закончыла 7 класаў і паступіла ў настаўніцкую семінарыю ў Нясвіжы. У час нямецкай акупацыі дзейнічала ў СБМ. Пасля заканчэння вайны працавала бухгалтаркай у Гарадзеі. У 1949 годзе, на праваслаўны Новы год, арыштаваная. Была цяжарнай.

Руская трагедыя ☞ 10

Гэта здарылася летам 1944 года, калі рускія гналі немцаў на захад. На Бахматах, дзе цяпер слаўнае вадасховішча, стаяла савецкая ваенная часць і байцы адтуль наведвалі Дубічы-Царкоўныя. Сярод іх вылучаўся культурнымі паводзінамі малады баец Андрэй родам з-пад Варонежа.

Абманулі нас, маці... ☞ 11

Данель Оўст з фірмы „Ванель" з Познані прадстаўляе бяльшчанам галоўны пункт праграмы — ваўняную пасцель. І з гэтага моманту вядучы роўна 2,5 гадзіны пераконваў сабраных у тым, што купля гэтай пасцелі акажацца найлепшай здзелкай жыцця.

Беларусь — беларусы

На радзіме Каліноўскага

У нядзелю 20 кастрычніка ў Свіслачы па склаўшайся традыцыі ўжо шосты год запар была ўшанавана памяць нацыянальных герояў Беларускага вызвольнага руху 1863-64 гадоў. Арганізавалі мерапрыемства мясцовыя актывісты Беларускага народнага фронту і недзяржаўных арганізацый. У мерапрыемстве ўзялі ўдзел прадстаўнікі шасці рэгіёнаў Гродзенскай вобласці.

Па традыцыі найперш усклалі кветкі да магілы Віктара Каліноўскага, старэйшага брата Кастуся Каліноўскага. Прадстаўнік Грамады В. Сазонаў падчас прамовы ўзгадаў не толькі пра Віктара, які быў натхняльнікам і настаўнікам Кастуся, але і пра тых людзей, якія адшукалі ягоную магілу і прывялі яе ў належны стан: Віктара Трышчановіча, Дзіму Кісяля, прафесара Ткачова.

Затым праз усю Свіслач калона з бела-чырвона-белымі сцягамі прайшла да помніка К. Каліноўскаму, дарэчы, адзінаму ў Беларусі. Тут таксама ўсклалі кветкі. У Свіслачы існуе Алея герояў, дзе былы старшыня райвыканкама А. Кузьма разам зграмадзіў помнікі Леніну, Сталіну (адзіны ў Беларусі), савецкім салдатам, Р. Траўгуту і К. Каліноўскаму. Падчас ускладання кветак да помніка Траўгуту, В. Сазонаў заўважыў, што толькі ў Беларусі побач ставяць помнікі нацыянальным героям і злачынцам, якія знішчалі народ. Ён заклікаў людзей па ўсіх мястэчках і гарадах далучыцца да акцыі, якая праводзіцца ў Гродне па зборы подпісаў за дэмантаж помніка Леніну і замену яго на помнік К. Каліноўскаму. В. Сазонаў прапанаваў праводзіць такія акцыі ва ўсіх гарадах і мястэчках, паколькі паўсюль у Беларусі засталіся помнікі бальшавіцкім лідэрам.

Пасля гэтага калона аўтамабіляў пад бела-чырвона-белымі сцягамі накіравалася ў Якушоўку на радзіму Каліноўскіх. Там таксама былі ўскладзены кветкі.

М. Мікалайчык
„Биржа информации"
№ 246 ад 24.10.2002 г.

Аб рэканструкцыі пагранперахода Брузгі — Кузніца-Беластоцкая

Беларускім знешнепалітычным ведамствам працягваецца праца па ўзаемадзеянню з польскім бокам па пытаннях паскарэння рэканструкцыі і адкрыцця беларуска-польскага пагранічнага перахода ў Кузніцы-Беластоцкай (пункт пропуску Брузгі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь).

24 верасня г.г. адбылася сустрэча па гэтых пытаннях Генеральнага консула Беларусі ў Беластоку Леаніда Каравайкі з Падляшскім ваяводам Маркам Стшалінскім.

Падчас перамоў беларускі бок праінфармаваў аб ходзе будаўнічых работ па рэканструкцыі дарогі, якая злучае беларускі пункт пропуску Брузгі з польскім пунктам пропуску Кузніца-Беластоцкая на беларуска-польскай дзяржаўнай мяжы. 10 верасня г.г. з удзелам прадстаўнікоў польскага боку адбыўся тэндэр на правядзенне згаданых работ, у якім перамагло Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства Дарожна-будаўнічы трэст № 6 з Гродна. Земляныя работы на 370-метровым участку дарогі распачаты 12 верасня, і чакаецца, што работы па рэканструкцыі дарогі скончацца напрыканцы лістапада 2002 года.

З польскага боку тэндэр на правядзенне чарговага этапу работ па рэканструкцыі пагранічнага пераходу выйграла фірма Warbud S.A.

Рэканструкцыя пагранперахода з польскага боку вядзецца на працягу двух гадоў. Тэрмін завяршэння ўсіх будаўнічых работ — 2004 год.

Рух легкавога аўтатранспарту і аўтобусаў праз пагранпераход Брузгі — Кузніца-Беластоцкая плануецца аднавіць з 1 студзеня 2003 года. Вялікагрузныя аўтамабілі змогуць перасякаць мяжу праз згаданы пункт пропуску не раней кастрычніка 2003 года.

Прапускная здольнасць пагранперахода Брузгі — Кузніца-Беластоцкая пасля рэканструкцыі складзе 8 тысяч легкавых і 1,5 тысячы грузавых аўтамабіляў, а таксама 25 тысяч грамадзян за суткі.

www.mfa.gov.by

Будзе заграніччны пашпарт

Аляксандар Лукашэнка загадаў кіраўніцтву Міністэрства ўнутраных спраў тэрмінова вырашыць пытанне ўвядзення другога пашпарту для грамадзян Беларусі.

Адпаведны законапраект ужо падрыхтаваны палатай прадстаўнікоў. Афіцыйныя асобы тлумачаць гэта тым, што людзі, якія часта выязджаюць за мяжу, будуць мець меней клопатаў з заменай пашпартоў, якія ад шматлікіх візаў хутка становяцца непрыгоднымі да ўжытку.

Значная частка грамадзян Беларусі разпораз выстойвае вялізныя чэргі ў калідорах гэтак званых АВІРаў, каб памяняць запоўнены візамі пашпарт на новы. Гэта найперш людзі, якія паводле прафесійных абавязкаў ці па справах бізнесу часта выязджаюць па-за межы Беларусі. Так, статыстыка сведчыць, што шафёры-дальнабойшчыкі вымушаны мяняць пашпарты 2-3 разы на год. Тое самае і са спартоўцамі. Частыя госці АВІРаў — гэтак званыя „чаўнакі", бізнесоўцы, палітыкі: практычна кожны ваяж за мяжу для іх распачынаецца з уклейвання ў пашпарт візы краіны прызначэння, якая займае цэлую старонку. А іх у цяперашнім пашпарце толькі 16. У пашпартна-візавай службе МУС кажуць, што паратунак у дадзенай сітуацыі толькі адзін — увядзенне адмысловага пашпарту дзеля выездаў за мяжу. Пры гэтым грамадзяне будуць мець яшчэ асобны пашпарт дзеля ўнутранага карыстання з адзнакамі пра прапіску, шлюб, дзяцей.

„Биржа информации"
№ 246 ад 24.10.2002 г.

Чарговы этап вечнага змагання

Пачатак кастрычніка для Беларусі стаў характэрным новым этапам узмацнення барацьбы. Гэтым разам барацьбы з карупцыяй у органах улады.

Як ужо звычайна стала ў сучаснай беларускай рэчаіснасці, усе праблемы і правалы ў эканоміцы і, зразумела, у палітыцы, народ, а разам з ім і трымаючыя ўладу, звязваюць з канкрэтнымі персонамі. Такое разуменне недахопаў, відаць, бярэ свой пачатак яшчэ са сталінскіх часоў, калі рознага кшталту палітычныя працэсы над „ворагамі народу" тлумачылі невыкананне планаў пяцігодак, сабатаж, шкодніцтва і таму падобнае. У лагеры накіроўваліся дзесяткі тысяч ні ў чым не павінных грамадзян, якія рабіліся таннай працоўнай сілай для „будоўляў камунізму".

Зразумела, сённяшняя Беларусь гэта не Савецкі Саюз 30-50-х гадоў мінулага стагоддзя. Аб масавых рэпрэсіях казаць, па меншай меры, заўчасна. Разам з тым рэцыдыўныя праяўленні сталінскіх падыходаў у кіраванні эканомікай — увачавідку.

8 кастрычніка быў апублікаваны прэзідэнцкі ўказ аб дзяржпраграме па ўзмацненні барацьбы з карупцыяй на 2002-2006 гады. Самае дзіўнае, што змагацца з гэтым злом у калідорах улады абавязваюцца самі яе прадстаўнікі. Калі да карупцыі падыходзіць дыялектычна, то яна ў нечым нагадвае прастытуцыю, калі попыт нараджае прапанову. З прастытуцыяй змагаліся амаль заўсёды, але марна. Тое ж самае можна казаць і аб змаганні з карупцыяй, якая, шчыра кажучы, заўсёды была, ёсць і будзе. Асабліва гэта тычыцца грамадстваў, дзе дзейнасць улады пастаўлена па-за кантролем грамадскасці і кожны чыноўнік часцяком становіцца царом і суддзёй для звычайнага наведніка яго кабінета. Як тут абысціся без спробы матэрыяльна залагодзіць апошняга дзеля дасягнення сваёй мэты — ад хутчэйшага падпісання якойсьці даведкі да спрыяння ў атрыманні грашовага крэдыту?

Найбольш дзейсны спосаб барацьбы з такім сацыяльным злом выпрацавала дэмакратыя. Калі за дзеяннямі цяперашніх кіраўнікоў пільна сочаць іх палітычныя апаненты, бо для апошніх кожны пралік канкурэнтаў, тым больш парушэнне закону, ускосна надае дадатковыя ачкі ў вачах выбаршчыкаў. Канешне, не заўсёды і тут абыходзіцца без хібаў — грошы і хабар — рэчы, якія з лёгкасці могуць прымірыць палітычных праціўнікаў, але ўскрыццё такога прымірэння ў свабоднай прэсе ўздымае неверагодны вэрхал у грамадстве.

Зараз у Беларусі адной з найбольш пацярпелых груп ад „антыкарупцыйнай" барацьбы сталі дырэктары прамысловых прадпрыемстваў. На працягу года ідзе з імі даволі цікавая гульня. Спачатку пад рознымі абяцаннямі падтрымкі дзеяннямі на такіх пастах людзей здольных кіраваць прадпрыемствам прызначаюць на высокія пасады, а потым пачынаюць абвінавачваць у розных грахах і праліках. Пасля невялікага тэрміну гаспадарніка гучна здымаюць, пры гэтым часцяком нават заводзяць крымінальную справу. Прадпрыемства затым трапляе пад поўны кантроль патрэбных уладзе людзей. Менавіта аб такіх абставінах кіравання эканомікай распавёў незалежнай прэсе паспеўшы звольніцца па ўласным жаданні былы кіраўнік Беларускага металургічнага завода Вадзім Філіпаў.

У выніку паўстае пытанне: дзеля чаго трэба спачатку прызначаць чалавека, пры гэтым добра пра яго адгукаючыся, а потым з вэрхалам здымаць? І чаму такія „антыкарупцыйныя меры" тычацца не толькі гаспадарнікаў, але і дзяржаўнага чынавенства? Адказ, здаецца, у прымаўцы — народ патрабуе хлеба і гледзішчаў. Праўда, пры цяжкасцях з „хлебам" на першы план усё часцей выходзяць „гледзішчы".

Уладзімір Лапцэвіч

Зварот сакратарыята ТБМ

Адновім беларускі музей Івана Луцкевіча

7 кастрычніка 2002 г. Камітэт Сойма Літоўскай Рэспублікі па асвеце, навуцы і культуры прыняў гістарычнае рашэнне аб аднаўленні ў Вільні беларускага музея Івана Луцкевіча як філіяла Літоўскага нацыянальнага музея.

ТБМ вітае гэты крок, накіраваны на пашырэнне культурна-асветніцкіх сувязей паміж беларускім і літоўскім народамі, якія заўжды сябравалі і маюць супольную спадчыну.

Мы спадзяемся, што Міністэрства замежных спраў і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь станоўча адгукнуцца на гэтую ініцыятыву літоўскіх парламентарыяў і дапамогуць аднавіць адзін з лепшых беларускіх музеяў першай паловы XX стагоддзя.

Мы звяртаемся да творчых саюзаў Беларусі, прадстаўнікоў шырокай грамадскасці падтрымаць Таварыства беларускай культуры ў Літве, ініцыятара ідэі адраджэння Беларускага музея ў Вільні, і перадаць экспанаты са сваіх фондаў і асабістых калекцый у экспазіцыю будучага музея.

Сакратарыят ТБМ, 17.10.2002 г.

Люду змаганне за ўладу

[1 ☞ працяг]

цоўнага люду змагаліся на ўсіх ваяводскіх з'ездах Польскай аб'яднанай рабочай партыі. Цяпер гатовы яны свой інтэлект прысвяціць працы ў карысць капіталістаў, беспрацоўных і праваслаўнай веры.

У мінулым годзе падчас з'езду Беларускага дэмакратычнага аб'яднання адзін з дэлегатаў гаварыў: „Я хоцяж естэм поляк, то естэм такжэ бялорусін з крві і косці". Калі пабачыў я гэтага таварыша, які раздаваў у царкве прапаганду Саюза левых дэмакратаў, зразумеў, што ў нас абсалютна ўсё магчымае. Можна быць адначасова палякам і беларусам „з крві і косці", веруючым і атэістам, правым і левым, рускім палякам і праваслаўным католікам. Нуль лаяльнасці, нуль ідэйнасці. Вечна беднае мужыцтва. Не адмянілі гэтага ні катэджы ў вялікім горадзе, ні дарагія самаходы, ні дырэктарска-прафесарскія званні. Відаць, такі генетычны код атрымалі мы ад продкаў.

Яўген Мірановіч

Доктар Уладзімір Манцюк

Яго прыязны позірк, цёплая ўсмешка, добразычлівыя словы і залатыя рукі вяртаюцца ў памяць тым, каму згадваецца ягонае прозвішча. Сёлета доктар Уладзімір МАНЦЮК адзначае 45-годдзе працы дзеля нашага здароўя.

— *Калі і дзе Вы нарадзіліся?*

— Я нарадзіўся 22 ліпеня 1938 года ў вёсцы Грузка Кляшчэлеўскай гміны ў сялянскай сям'і.

— *Як праходзіла Ваша адукацыя?*

— Першыя чатыры класы я вучыўся ў школе ў Грузцы, а наступныя тры — ад пятага да сёмага — у адлеглых за сем кіламетраў Мілейчычах, куды штодзённа даязджаў на веласіпедзе. Пасля пачатковай школы два гады вучыўся ў Агульнаадукацыйным ліцэі ў Сямятычах, а калі закончыў дзевяты клас, пайшоў у Фельчарскі ліцэй у Торуні, які закончыў у 1957 годзе.

— *Што Вы рабілі далей, пасля Фельчарскага ліцэя?*

— 1 кастрычніка 1957 года пачаў працу ў Вясковым асяродку здароўя ў Вульцы-Нурэцкай, а пасля перайшоў на працу — таксама ў Вясковы асяродак здароўя — у Снежкі, дзе працаваў да кастрычніка 1961 года.

У кастрычніку 1961 года паступіў я на Медыцынскую акадэмію ў Беласток, якую закончыў у 1967 годзе.

— *Дзе Вы працавалі пасля Акадэміі?*

— З чэрвеня 1967 года адбыў я паслядыпломную стажыроўку ў Павятовым шпіталі ў Гайнаўцы і калі яе закончыў стаў на працу ў Хірургічнае аддзяленне таго ж шпіталя на пасаду малодшага асістэнта. У 1973 годзе здаў я экзамен на першую ступень спецыялізацыі ў галіне агульнай хірургіі і стаў дадаткова працаваць у Хірургічнай амбулаторыі. У красавіку 1978 года здаў я чарговы экзамен — на другую ступень спецыялізацыі.

У лютым таго ж года памёр Генрык Некраш, ардынатар майго аддзялення і ў чэрвені Ваяводскі кансультант па справах хірургіі дацэнт Адам Доўгірд даверыў мне абавязкі ардынатара Хірургічнага аддзялення шпіталя ў Гайнаўцы, нягледзячы на тое, што я быў наймалодшым хірургам. Праз пару гадоў дваіх маіх старэйшых супрацоўнікаў памерлі, а трэці перайшоў на працу ў амбулаторыю. Давялося арганізаваць калектыў з маладых медыцынскіх работнікаў. Працавалася складана, цяжка было запэўніць кругласутачную апеку, бо ніхто з маладых лекараў не меў спецыялізацыі. Маладыя супрацоўнікі вымушаны былі ездзіць на курсы ў Беласток і часта на аддзяленні з шасцідзесяццю хворымі я аставаўся толькі з адным асістэнтам. Бывала, што для асісціравання ў час аперацыі я быў вымушаны браць медсясцёр, бо не было лекара... З ходам часу маладыя сябры вывучыліся і праца аблегчылася. Пад маім кіраўніцтвам семярых лекараў атрымалі першую ступень спецыялізацыі, а траіх — другую. Некаторыя сталі спецыялізавацца ў артапедыі і калі адзін з іх атрымаў другую ступень, з Хірургічнага выдзелена Артапедычнае аддзяленне.

— *Колькі ложкаў сёння на Хірургічным аддзяленні і колькі лекараў займаецца хворымі?*

— На аддзяленні маем 34 ложкі. Здараецца, аднак, што прыходзіцца дастаўляць ложкі і бывае, што на аддзяленні ляжыць і сорак хворых. У аддзяленні, акрамя мяне, працуе яшчэ траіх хірургаў.

— *Ці гэты лік дастатковы?*

— На сённяшні час — поўнасцю.

Фота ВІКТАРА БУРЫ

Дырэктар Рыгор Тамашук (справа) уручае доктару Уладзіміру Манцюку (злева) пахвальную грамату за выдатныя заслугі для службы здароўя ў Гайнаўцы

— *Ці ў мінулым, маючы шмат працы ў шпіталі, знаходзіўся ў Вас час на грамадскую працу?*

— Прызнаюся, што маё жыццё было поўнасцю запоўнена шпітальнай працай, аднак, нягледзячы на гэта, я два скліканні быў радным Гарадской рады ў Гайнаўцы.

— *Якія дзяржаўныя ўзнагароды Вы атрымалі?*

— Залаты і Бронзавы крыжы заслугі, ганаровую адзнаку „За ўзорную працу ў службе здароўя" ды дыпломы „Заслужаны для Гайнаўкі" і „Заслужаны для аховы здароўя Гайнаўкі".

— *Вы калі задумоўваліся, колькіх хворых аперыравалі?*

— Думаю, што мала менш, чым сёння жыхароў Гайнаўкі.

— *А колькі пацыентаў за час Вашай працы прайшло праз Хірургічнае аддзяленне?*

— Ну, гэта быў бы лік удвая перавышаючы лік жыхароў Гайнаўкі.

— *Як Вам складваецца супрацоўніцтва з дырэкцыяй Самастойнага публічнага комплексу аховы здароўя ў Гайнаўцы?*

— Як лёгка падлічыць, у кастрычніку г.г. мінула 45 гадавіна маёй працы ў службе здароўя. За гэты перыяд ахова здароўя праходзіла розныя выпрабаванні. Быў час, калі былі грошы, але складана было раздабыць медыцынскія прылады і лекі. Сёння з гэтым няма клопатаў, затое маем вялікія фінансавыя складанасці. У такіх абставінах заўсёды ўзнікаюць дыскусіі між дырэкцыяй і кіраўнікамі паасобных арганізацыйных адзінак, бо грошай не хапае літаральна на ўсё. Мне здаецца, што супрацоўніцтва між намі здавальняючае. Нашай супольнай мэтай з'яўляецца функцыяніраванне шпіталя і як мага найлепшы догляд за хворымі.

— *Дзякую за размову.*

Гутарыў Віктар Бура

Сваякі на мяжы

Каля паловы афіцэрскага саставу занятага ў наступным годзе ў памежнай стражы прыйдзе ў тыя службы з арміі. Частка службоўцаў — гэта будуць мясцовыя, — заявіў у Міхалове віцэ-міністр унутраных спраў і адміністрацыі Збігнеў Саботка.

У суботу (19 кастрычніка) адкрылі тут чарговую на ўсходняй мяжы пагранзаставу, тыдзень пасля пуску ў рух пагранзаставы ў Дубічах-Царкоўных. Такім чынам лік пагранзастаў у Падляшскай часці Памежнай службы пабольшыўся да 17. Міхалоўскія пагранічнікі будуць ахоўваць 22 кіламетры мяжы. Абсяг адказнасці пагранзаставы ахоплівае тэрыторыю гміны Міхалова, у сферы яе дзейнасці знаходзіцца пераход спрошчанага памежнага руху ў Ялоўцы. Забяспечана яна ў сучаснае тэлекамунікацыйнае абсталяванне (для прыкладу, тэлефон дзяжурнага высвятляе нумар, з якога наступіла сувязь), матацыклы (Хонда, ТРХ, КТМ) і Ландроверы.

Адкрыццё пагранзаставы было падзеяй у жыцці ўсяго Міхалова. Адзін са старажылаў тлумачыў, як дайсці да яе з аўтобуснага прыпынку ПКС:

— Проста, пасля ўлева і да канца Міхалова зноў проста, а пасля — направа.

І дадаваў усхвалявана:

— Мусі, Мілер прыедзе.

Прэм'ер, незалежна ад таго, што спадзяваліся яго, не прыехаў; удзельнічаў у пасяджэнні ўрада з нагоды першай гадавіны яго прызначэння. На верталёце затое прызямліліся на полі перад пагранзаставай віцэ-міністр Збігнеў Саботка і шэф Памежнай службы генерал брыгады Юзаф Клімовіч. Апроч афіцыйных гасцей на ўрачыстасць адкрыцця прыбыла шматлюдная група жыхароў. Ужо паўгадзіны раней маршыравала яна ў бок пагранзаставы па толькі што вылітай асфальтам дарозе.

— Хочам, каб будучая мяжа Еўрасаюза была прыязнай для ўсіх наведваючых нашу краіну і праязджаючых цераз Польшчу, асабліва для нашых суседзяў. Ды адначасна — каб была шчыльнай для тых, хто прабуе яе нарушыць з парушэннем абавязваючых законаў, — гарантаваў ген. Юзаф Клімовіч.

— Аддаючы ў карыстанне пагранзаставу польская дзяржава ўдакументоўвае, што моцна стаіць на стражы ладу, парадку і бяспекі, — казаў ваявода Марэк Стшалінскі.

У размове з журналістамі віцэ-міністр Саботка гарантаваў, што Памежная служба мае намер поўнасцю прафесіяналізавацца. У праекце бюджэту на будучы год прадугледжваецца стварэнне 700 новых штатаў, але ведамства ўнутраных спраў хадайнічае за яшчэ 600:

— Да 2006 года маем намер прыняць у ПС больш за 6 000 службоўцаў. На ўсходняй мяжы хочам, каб яны адтуль паходзілі, тады такая служба намнога таннейшая. Да таго, паколькі армія скарачае свае штаты, будзем прымаць на службу вайсковых афіцэраў. У будучым годзе можна паспяхова пераняць 50 працэнтаў штатаў ад арміі.

Фота МАЦЕЯ ХАЛАДОЎСКАГА

Злева: ваявода М. Стшалінскі, віцэ-міністр З. Саботка і ген. Ю. Клімовіч

Заява набору службоўцаў з ліку мясцовых жыхароў абнадзеіла ўлады і шмат якіх маладых, у якіх малыя магчымасці знайсці якую-небудзь працу на тэрыторыі свае гміны. Тым больш, што ў Міхалове ў апошні час упалі аддзел фабрыкі тканін імя Сяржана і малачарня.

— У гэты момант атрымалі працу на пагранзаставе шэсць цывільных асоб. Нашы людзі займаліся таксама пры яе пабудове і дарожных работах, — прызнаўся міхалоўскі войт Славамір Ёська.

Пры нагодзе неафіцыйнай размовы з камендантам падляшскай паліцыі войта запэўнілі, што пасля самаўрадавых выбараў (каля снежня) вернецца пытанне вяртання ў Міхалова пастарунка паліцыі.

На ўсходняй мяжы да 2004 г. мае быць адданых у карыстанне яшчэ сем пагранзастаў, так, каб кожны адрэзак мяжы не быў даўжэйшы за 20-25 кіламетраў.

Пагранзаставай у Міхалове кіруе маёр Альгерд Мішуканіс, да гэтай пары аперацыйны афіцэр Падляшскай часці Памежнай службы.

Мацей Халадоўскі

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Вачыма паляка

Выбарчая панская ласка

Пішу гэтыя словы яшчэ перад выбарчай цішай. Не ведаю яшчэ, хто пераможа, а хто будзе ў вялікім пройгрышы. Цяжка гэта прадказаць, асабліва калі ў апошні выбарчы уік-энд брыў я ў час шпацыру з сабакам праз гушчу лістовак, месцамі большую за капцы згрэбленай апалай лістоты. Некаторыя лістоўкі я нават падымаў, зацікаўлены, што гэты, вось, кандытат з мае акругі мае што сказаць мне. Некаторыя з іх схітрылі. Пэўна, усведамляючы тое, якія мізэрныя шанцы маюць на ўваход у гарадскую раду ці сеймік, далучалі да рэкламы свае кандыдатуры рэкламу свае фірмы. Вось, для прыкладу: адзін з маладзёнаў, стараючыхся за мандат у беластоцкай Гарадской радзе ад СЛД, можа, і не быў пераканальны для свае асобы як самаўрадавец, але нявыключана, што хтосьці ў нашым мікрараёне закажа вокны ў яго прадпрыемстве, рэкламаваным на адной гумцы з яго выявай і г.зв. выбарчай праграмай. Ну, дык якісьці прыбытак ад гэтага кандыдавання будзе.

Шмат кандыдатаў, якіх я выслухаў у тэлебачанні, радыё і якіх улёткі чытаў, няшмат ведае аб кампетэнцыі сваіх мроеных самаўрадаў. Няраз ад хадайнічаючых за крэсла ў сейміку здаралася чуць, як гэта яны, для прыкладу, старацца будуць за развіццё асветы. Толькі што школы ў значнай частцы не падлягаюць ваяводскаму самаўраду. Няведанне кампетэнцыі самаўрадаў гмінных, павятовых і ваяводскай было ў гэтай кампаніі, на маю думку, найбольш слабым пунктам прэтэндэнтаў.

Не магу ўстрымацца і не ўспомніць пра пацешную нервовасць у шэрагах падляшскага СЛД у сувязі з самастойным стартам у Беластоку беларусаў і ўзнікненнем Беларускага выбарчага камітэта. Да „тэмы" што і руш асабіста вяртаўся дэпутат Мечыслаў Чарняўскі, старшыня Саюза ў нашым рэгіёне. У час адной выбарчай прэс-канферэнцыі, пасля прэсавай буры, якую выклікала яго кантраверсійнае выказванне на тэму БВК — старшыня Чарняўскі ў святле тэлевізійных юпітэраў падкрэсліў, што ў гэтых выбарах на Падляшшы кааліцыя Саюз левых дэмакратаў — Унія працы пашырана на прадстаўнікоў беларускага, праваслаўнага асяроддзя. Аднак ужо ў тэлевізійных рэкламках другі з лідэраў мясцовага Саюза Збігнеў Кшывіцкі ўсё заахвочваў ды заахвочаў аддаць свой голас на кааліцыю СЛД-УП, з таго, што я заўважыў, прамоўчваючы ўдзел на спісках кандыдатаў, пра якіх раней успомніў дэпутат-старшыня. Таксама некаторыя кандыдаты-беларусы з таго камітэта нясмела выказвалі ў сваіх лістоўках, што хацелі б зрабіць асяроддзю, з якога выйшлі. У адной з іх я прачытаў на гэту тэму тры агульныя заўвагі: козырам у прамоцыі Беластока павінна быць тое, што ён — асяроддзе нацыянальна і рэлігійна разнастайнае, улада павінна быць у руках людзей кампетэнтных незалежна ад іх палітычнай, нацыянальнай ды канфесійнай прыналежнасці, а ўрэшце, у апошнім пункце выбарчай праграмы, гучаў лозунг „талерантнасць у адносінах да нацыянальнасці і веравызнання". Цікава, ці такую талерантнасць удалося б выпрацаваць шляхам пастановы радных.

Ласка электарата ездзіць на рабым кані. Пэўна, сёння, калі паказаўся гэты нумар „Нівы", ужо вядома, хто будзе намі кіраваць. Незалежна ад выніку, для мяне ў гэтых выбарах найважнейшым было тое, што значная частка актыўнага беларускага асяроддзя рашылася на самастойнасць, адважылася паказаць, што гатова вырашаць сама аб сабе і ўсёй грамадскасці Беластока і рэгіёна ды дбаць пра супольныя інтарэсы нас усіх не горш ад груповак, якія ўжо зрабіліся залежнымі ад *rządzenia*. Так, як іхныя кандыдаты, падкрэсліваючыя свае козыры ў кампаніі: *mam wieloletni staż pracy na różnych stanowiskach kierowniczych*. Памыляецца той, хто мяркуе, што быць „кіраўніком" можна раз і назаўсёды, што гэта прафесія, да таго пажыццёвая, і што гэта аргумент апраўдваючы тую гонку да ўлады, пад хвастом, які гарантуе яе дасягненне.

Мацей Халадоўскі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Дыпламаваны настаўнік

Гутарка з настаўнікам інфарматыкі Гайнаўскага белліцэя Славамірам ЧЫКВІНЫМ.

— Нядаўна сталі Вы дыпламаваным настаўнікам (як трэці ў школе). Што было характэрнае для Вашай стажыроўкі?

— Трэба было выканаць многа работы, сабіраючы ўсялякія дакументы. Кожную дзейнасць трэба было рэгістраваць, пацвердзіць пячаткамі і подпісамі адпаведных асоб. Абавязкова апісаць пазакласную работу, працу з моладдзю, поспехі ў спаборніцтвах. Неабходна падрыхтаваць дакументацыю звязаную з узнагародамі і поспехамі ў працы. Уласныя ініцыятывы ў рабоце і супрацоўніцтва з асяроддзем таксама павінны быць апісаны і прадстаўлены камісіі, якая мяне ацэньвала.

— Якімі ініцыятывамі можаце пахваліцца?

— Апрацаваў я праграму для падрыхтоўкі вучняў да экзаменаў на вадзіцельскія правы на мотаролер, выкарыстоўваючы ў ёй працу з камп'ютэрамі і іншымі дапаможнікамі. Выканаў я індывідуальную сістэму ацэнкі вучняў, прадставіў аўтарскі спосаб падвядзення вынікаў у вучобе і прадставіў яго настаўнікам. З маімі метадамі навучання маглі знаёміцца іншыя настаўнікі ў час адкрытых урокаў.

— А што можаце расказаць наконт супрацоўніцтва з асяроддзем?

— Супрацоўнічаў я з беларускімі суполкамі пры арганізаванні фэстаў і аглядаў беларускіх калядак. Трымаў кантакт з Аддзяленнем дарожнага руху Павятовай камендатуры паліцыі ў Гайнаўцы ў час экзаменаў на мотаролерныя правы. Рыхтуючы моладзь з белліцэя да турніраў супрацоўнічаў я з Асяродкам навучання вадзіцеляў „Падлясяк" і з Тэлекамунікацыйным прадпрыемствам у справе падключэння камп'ютэраў да Інтэрнэту.

— Калі пра камп'ютэры, дык як абсталяваныя камп'ютэрныя кабінеты ў школе?

— Разам з дырэктарам Яўгенам Сачко апрацавалі мы праект выкарыстання інтэрнэтавага кабінета для адукацыйных патрэб. Як адзіная школа ў Гайнаўскім павеце атрымалі мы з Міністэрства адукацыі новыя камп'ютэры і друкарскае абсталяванне. Вучні могуць карыстацца Інтэрнэтам для адукацыйных патрэб і пасля ўрокаў. У адну сістэму ўключылі мы камп'ютэры адміністрацыі і бухгалтэрыі, што палепшыла іх працу.

— Ці трэба было ездзіць на дадатковыя курсы павышэння кваліфікацый?

— Праца з камп'ютэрамі мае такі характар, што ўвесь час трэба многа вучыцца і не толькі ў час стажыроўкі я павышаў свае кваліфікацыі на курсах.

— Вы сказалі, што важная была пазакласная работа.

— Разам з вучнямі стварылі мы і вялі на польскай, беларускай і англійскай мовах школьную старонку ў Інтэрнэце. Рыхтаваў я вучняў да турніраў „Спраўныя як жаўнеры", у якім занялі мы II месца ў цэнтральных спаборніцтвах, а на Матарызацыйным турніры нашы белліцэісты занялі III месца ў маштабе Падляшскага ваяводства.

— Настаўнікі гавораць, што цяжка правільна прадставіць дакументы.

— Дакументы трэба сабіраць сістэматычна, бо праз тыдзень або месяц іх не збярэш. У мяне не было дакладных інфармацый, як трэба прадставіць усю дакументацыю і мусіў вучыцца на сваіх памылках. У час стажыроўкі не трэба здаваць экзамены, але на падставе пасведчанняў трэба паказаць усю сваю працу. Зараз плануецца пабольшыць патрабаванні ад настаўнікаў, якія хочуць стаць дыпламаванымі.

— Дзякую за размову.

Размаўляў Аляксей Мароз

Цаню „Ніву" аднолькава

Можна на „Ніву" гневацца і не гневацца і нават у найгоршы мой „крызіс" я заўсёды чытаю яе ад дошкі да дошкі. Ці калісьці яна была цікавейшая, чым сёння? Думаю, што не, і цаню яе аднолькава. Калісь у „Ніве" друкаваліся пахвалы партыйным царыкам і сакратарам і тая палоска толькі псавала нервы сумленным людзям; на шчасце, гэтай пустаты ўжо няма. Я тады закідаў „Ніве", што яна выхваляе гэты партыйны зброд, які „Ніву" стараўся абліць граззю і зліквідаваць, але, вядома, такія допісы не маглі прабіцца ў друк.

Але гэта ўжо мінулае і ніколі не вернецца. Цяперашні час таксама ружамі не высцелены, таксама не бракуе жулікаў у розных установах, якія толькі і стараюцца, каб кагось абдуць і ашукаць. Пра гэта трэба пісаць у „Ніве", каб зло не царыла ў нашых радах.

Я атрымліваю з-за рубяжа іншыя беларускія газеты, але ім да „Нівы" далёка, бо там артыкулы манатонныя, доўгія і нудныя, дзе выхваляюцца розныя магнаты і шляхта, як Радзівілы, Сапегі і іншыя шляхецкія наймітыі і падлізы, якія нас за нішто мелі.

Я таксама за тое, каб палоска „Парнасік" вярнулася на старонкі „Нівы". У „Ніве" друкуюцца розныя матэрыялы: і лепшыя, і горшыя, але дзе тут, у канцы, набрацца гэтых найлепшых, бо ж і яны, так як і людзі, дзеляцца на добрыя, пасрэдныя і дрэнныя. Яшчэ ніводная газета стопрацэнтна не задаволіла чытачоў, бо і няма дасканалых людзей.

Яшчэ адно мяне здзіўляе: што большасць нашых карэспандэнтаў у розных установах размаўляе выключна па-польску, а іх дзеці і ўнукі ні слова не ўмеюць па-беларуску. Дык чаму бацька-карэспандэнт не навучыў іх роднаму?

Мікалай Панфілюк

Літаратурна-мастацкая старонка № 511

Вернісаж, 6 верасня 2002 г. На першым плане справа: Жан-Франсуа Дэланэ — ініцыятар выставы

Мікола Давідзюк у Арасе

Мастак Мікола Давідзюк, прафесар Акадэміі выяўленчага мастацтва ў Лодзі, у сваім творчым жыцці ўдзельнічаў у каля трыццаці калектыўных выстаўках у краінах Еўропы. Першая яго персанальная выстаўка ў Францыі адбылася ў днях 7-21 верасня ў горадзе Арас. У Культурным офісе сталіцы дэпартамента Па-дэ-Кале экспанавалася каля 15 карцін з выявамі чалавечых твараў.

Суарганізатарам выстаўкі было мясцовае паланійнае аб'яднанне „Polskartois" па ініцыятыве Жана-Франсуа Дэланэ — даследчыка і папулярызатара беларускай культуры (у 2000 годзе ўдзельнічаў ён у „Беларускім трыялогу: Польшча — Англія — Францыя" ў Лапічах пад Крынкамі, дзе сутыкнуўся з творчасцю Міколы Давідзюка і зацікавіўся яго арыгінальным мастацтвам).

Французскія крытыкі адзначылі, што карціны Міколы Давідзюка даследуюць рэсурсы чалавечага твару. Прадстаўляюць яны шматлікія станы сутнасці і супярэчлівасці, якія жывуць у кожным індывідууме. Паасобныя карціны паказваюць характары, іх зносіны між сабою і кантакты, губы і насы, якія не знаходзяць свайго звычайнага месца. Шматлікія знакі на карцінах выяўляюць складаную структуру чалавечага ўнутранага жыцця.

Вернісаж адбыўся 6 верасня. У гэты дзень мясцовая газета „La Voix du Nord" („Голас Поўначы") у заяўцы пад загалоўкам „Вычварныя твары Давідзюка" так заахвочвала чытачоў наведаць выстаўку мастака з Лодзі: „Барочная духовасць? Выяўленчая абстракцыя? Лірычны самааналіз? Самі не ведаем як

Адна з карцін: авал ярка-сіні і чорны

ацаніць карціны Міколы Давідзюка (...). Карціны прадстаўляюць ледзь намечаны твары, сумныя, лёгка стомленыя. Каб склалася ў вас сваё ўяўленне, неабходна вам прысутнічаць на вернісажы з удзелам спадара Давідзюка".

Паводле французскага друку
апрацаваў Андрэй Герасімовіч

Аптэчніца

У начной аптэцы мусіць жыць аптэчнік. Ну, хай не жыць, дык хоць быць. А, мабыць, аптэчніца, падобная на аспірынавую Бабу-Ягу... Нашы вочы сустрэліся, калі я стала ў чарзе па таблеткі на добры сон. У аптэчным стэрыльна чыстым шкле адбівалася і я ў сваім джынсавым колеру індыга плашчы, і ўсе знерухомелыя ў злосці чакання чэргі да трох вакенцаў, моргалі лілова лямпы на слупах, вясёлкай рассыпаліся неоны, рэфлексіўнымі смугамі мільгалі аўтамашыны. Я ўбачыла ў шыбе свае вочы ў жалобным абрамленні стомы, і вочы аптэчніцы. Глюгаваты ейны нос звісаў пад іскрыстымі бялкамі, а рэшта ўяўнога аптэчніцкага цела трымцела пад ціхі звон шыбкі — быццам камар цененька запілікаў. Мая галава, якую сон не браў ужо трэцюю ноч, хітанулася ў бок, дзе павінна стаяць аптэчніца, ніжэйшая ад мяне або прыгнёная над гладкім прылаўкам, у які ўпіраюцца локцямі наведвальнікі начной аптэкі ўдзень і ўноч, а ноччу нават над імі падрэмваюць, пакуль чарга не дойдзе да круглага прарэзу ў шыбе і пані магістр не спытаецца ў цябе, чаго табе трэба ў начной аптэцы. Аптэчніца мела ўсё, як у людзей, хоць, замест паліто ці курткі, адпаведных на лістападаўскую халодную ноч, стаяла ў адным белым халаце ды басанож у палатняных тапцях на каўчукавай падэшве, такіх, як носяць у бальніцах прыбіральшчыцы. Я пераступала з нагі на нагу ў прамоклых адзідасах, якія абула перад тым, каб бегчы ў аптэку і купіць таблеткі на добры сон.

— Трэба мне, калі ласка, снатворную таблетку. Не сплю ўжо трэцюю ноч, — прамовіла я сіпла ў круглы прарэз, апырсканы па баках бацыламі ды вірусамі, выкашлянымі кліентамі аптэкі. Аптэкарка дастала з-пад прылаўка доўгую белую пушачку, з якой выцягнула срэбную бляшку з утопленымі ў ёй дзесяццю зялёнымі таблеткамі. Я паклала на талерачку, куды класці трэба грошы, каб заплаціць пані магістр за лякарства, дзесяць злотых. Апошнія, якія завяліся ў кішэні майго індыгавага незгібальнага баваўнянага плашча. З банкнота спачатку сплылі цыфры, пасля выява караля, стала яна звычайнай паперкай, а потым і зусім прапала на маіх вачах. А аптэкарка нязлосным стомленым голасам пыталася ўжо ў наступнай асобы, чаго ёй трэба, каб вылечыцца. Быццам я і не стаяла перад шыбай, і нічога не далі мне за мае апошнія дзесяць новых польскіх злотых.

Аптэчніца разявіла ў шыбе свой бязубы рот.

— Няма чаго смяяцца, — сіплым голасам прамовіла я. З шыбы ніяк не прападаў твар з грымасай нагадваючай ухмылку. На шкле ў мой бок працягнуліся твары людзей, што стаялі ў чарзе.

— Чаго глядзіце? Не бачылі, каб камусьці не далі таго чаго хоча, а грошы прапалі? — мой голас мацнеў у сваёй хрыпучасці. Усе твары на шыбе бліснулі бялкамі, стрэлілі вясёлкамі радужных абалонак вачэй. Я не вытрымала і адвярнулася да людзей, што стаялі за мной.

Яны мяне не бачылі і не чулі. Мёртва соваліся з нагі на нагу, пакашлівалі, сморкаліся ў папяровыя хустачкі, піхалі ў рукі аптэкарак доўгія рэцэпты ды грошы, бралі з іх фольгавыя торбачкі з лякарствам. А аптэчніца ў белым халаце ды шпітальных тапцях, нізенькая, з ніклым сівым хвосцікам перашчыкнутым жоўтай рэцэптурнай гумкай глядзела на мяне са спакойным дакорам у шэрых вачах.

— Не пі таблетак на добры сон. Ты ўжо саснілася ў чыімсь добры сне. Таблетка табе не паможа.

— Дайце мне штосьці на любы сон. Можа быць і жахлівы, і тужлівы, абы толькі заснуць!

— Дык ідзі са мной. Напіся са старой аптэчніцай маіх кропляў.

— Не пайду. Ведаем такіх, хто вашы кроплі піў.

Не, пайду ўсюды, куды мяне яна павядзе! Усё вып'ю. Абы толькі не медычны спірцік ад акушэркі Фаіны Фёдараўны! Абы!..

Пайшлі мы з аптэчніцай разам у кавярню, што побач начное аптэкі. Падселіся да століка, дзе сядзеў пан Юры з драматычнага тэатра і яго сяброўка Бася. Пан Юры мацаўся ніжэй плячэй — сёння ў поўдзень залез быў пад свой „фіат", каб паладзіць яго спадсподу, і не справіўся з тэхнікай.

— Скажы яму, Юрыю гэнаму, што натрэш яму тое смешнае месца, — запрапанавала аптэчніца, наліўшы ў маю шклянку з грэйпфрутавым сокам сваіх аздараўляльных кропель.

— Ну, скажу! — павесялела я, каўтануўшы лякарства.

— Ты зноў сама з сабою размаўляеш! — сяброўка Юрыя Барбара М., здаецца, і не вельмі здзівілася. — Усе ў кавярні кажуць, што не спіш ужо трэцюю ноч.

— Дзіва, што хочацца паразмаўляць са спагадлівым чалавекам?.. — уключылася аптэчніца ды шчодра накапала ў шклянку Барбары.

— Пэўна, што не дзіва. Ды не ліце ёй у віно гэтых кропель, бо будзе так, як з... — я аж укусілася ў язык. — Я ўжо ведаю, хто такі спагадлівы быў у выпадку аднаго нашага сябра! Капалі, капалі, ды дакапалі! Мы вас, спадарыня аптэчніца, ведаем! Толькі Адам Глобус можа з вамі справіцца.

— Ці-іха! — замахала далоняй у латэксавай пальчатцы аптэчніца. — Не выказвай пры мне імя гэтага паганага здрадніка! Прапануй масаж гэтаму тэатралу.

Я запрапанавала. Юры не быў супраць. Не тое, што ягоная сяброўка Барбара М. І зноў я стала скандалісткай, вядомай на заходнім пасажы цэнтра ваяводскага падляшскага горада. Гэта там, дзе кнігарня, антыкварыят, славутая кавярня ды аптэка, у якой жыве аптэчніца з цудадзейнымі кроплямі на добры сон.

Міра Лукша

Новае выданне

Трыялеты ад Юркі Голуба

Нават і не прыпомню, каб раней у Беларусі асобнаю кнігаю выдаваліся трыялеты. Ніл Гілевіч, напрыклад, у 1976 годзе выдаў арыгінальную кнігу лірычных васьмірадкоўяў пад назваю „Актавы". Соф'я Шах некалькі гадоў чакае выхаду ў свет у выдавецтве „Мастацкая літаратура" сваю кнігу санетаў. А вось гродзенскаму паэту Юрку Голубу сёлета пашанцавала выдаць у „Беларускім кнігазборы" сціплае кніжаня, як ён любіць казаць, трыялетаў з казачнаю назваю „Зажураны камень". У прадмоўцы аўтар піша: „Выбіраю для сябе рызыкоўную спробу: адчыніць даўнейшую ваконную раму трыялета ўласным дотыкам".

„Ваконная рама трыялета", ці па простаму кажучы — трыялет, мае даўнейшую гісторыю. Узнік ён яшчэ ў XV стагоддзі ў Францыі як скарочаная форма рандэля. У беларускую паэзію трыялет увёў Максім Багдановіч. Яшчэ са школы памятаецца яго васьмірадкоўны твор „Мне доўгае расстанне з Вамі...". Цяпер амаль у кожнага нашага паэта напісаны трыялеты. Настаў час падрыхтаваць і выдаць анталогію беларускага трыялета.

Юрка Голуб у сваёй новай кнізе разважае аб былым і сённяшнім часе, яго хвалюе лёс не толькі людзей, але і сама прырода і космас у цэлым. Паэт пытаецца: „Ці вызначыў нехта шляхі злавеснай каметы Галеі?" , а таксама задае пытанне: „ліст ападае на вецер, ці ў сховы народнай асвеце?". Наогул, звяртаюць на сябе ўвагу і загалоўкі трыялетаў Юркі Голуба. Назва кожнага трыялета складаецца толькі з аднаго слова. Па назвах вершы можна падзяліць на тэмы. Напрыклад, трыялеты пра птушкі і насякомых — гэта „Чайка", „Матылёк", „Мурашнік", трыялеты пра дрэвы і кусты — „Сасна", „Лес", „Рабіна", „Таполя", „Сад", „Лісце", трыялеты пра поры года — „Лістапад", „Мароз", „Завея", „Снег", „Прадвесне". Але галоўнаю тэмаю трыялетаў Юркі Голуба з'яўляецца тэма Бацькаўшчыны:

Спадчынны край на зары
І жылкаю мне далягае,
І з твару падобны да гаю
Спадчынны край на зары.
Ці будзе дарога даўгая,
Ці стану, як воблак, старым,
Спадчынны край на зары
І жылкаю мне далягае.

Кніга трыялетаў, безумоўна, заслугоўвае ўвагі з боку літаратуразнаўцаў і непасрэдна чытачоў. Найперш канкрэтнасцю і акрэсленасцю, сваёй прыхаванай глыбінёй і, вядома ж, формай верша.

Сяргей Чыгрын

Зорка

старонка для дзяцей

Вершы Віктара Шведа

Галена

Настаўніца гісторыі пытае
Вучняў з даўно мінулай старыны:
— Як называлася жанчына тая,
Што да Траянскай давяла вайны?

Ніхто не ведае, дык да Галены
Настаўніца звярнулася якраз:
— Як ты, жанчына звалася напэўна.
— Няўжо жанчына звалася Алмаз?

Пасля экзамену

Сынок з экзамену вярнуўся
І на парозе нечакана
Яго спыталася мамуся:
— Як табе ўдаўся той экзамен?

— Экзаменатар быў прыгожы,
Набожны, я адчуў адразу.
Ён толькі паўтараў: — „Мой Божа!"
Пасля маіх усіх адказаў.

Радак Сельвясюк

Мудрасць

Мудрасць — гэта сэнс жыцця
Хто ёю валодае,
Не будзе жыў у бядзе.
Вучыцца нам трэба,
Есці многа хлеба.
Не забудзь гэтых слоў,
Яны для цябе
Значаць больш як многа
Скарбаў.

(III „б" кл. Гімназіі ў Орлі)

Тадзіяна Кляшторная

Прадчуванне

Аблятае ліст з таполяў,
Лужы студзіць халадок,
Вецер лётае па полі
І пагладжвае стажок.
У вокны стукае сініца,
Кажа:
— Корм рыхтуйце мне.
Прадчуваю я, што восень
Хутка ўладу здасць зіме.

Фота АНДРЭЯ ГАЎРЫЛЮКА

Вядучыя Мая Саевіч і Караль Харкевіч

Дзень настаўніка ў Гайнаўцы

11 кастрычніка ў Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы адбылася ўрачыстасць з нагоды Дня настаўніка, якую падрыхтавалі гімназісты. Вучні мелі вельмі добры гумар, між іншым таму, што не было ў гэты дзень заняткаў. Усе з нецярплівасцю чакалі пачатку ўрачыстасці. Самыя першыя паявіліся вядучыя праграму — Мая Саевіч і Караль Харкевіч. Паводле іх слоў, першымі мелі выступіць раперы. Не мінула нават і хвіліна, калі мае вочы пабачылі чатырох першакласнікаў. Адзін з іх, праўдападобна, не найлепш навучыўся тэксту, але сітуацыю ўратаваў захапляючы ў сваёй ролі Мацей Васілюк. Затым быў паказ школьнай моды „на працягу тысячагоддзяў". Можна было пабачыць вучняў з каменнага веку, як і з нашых часоў. Да гэтага моманту мерапрыемства было вельмі цікавае. На жаль, чагосьці мне бракавала. Пасля я ўжо ведаў, чаго мне не хапала. Мае вушы яшчэ не пачулі ніводнага слова на беларускай мове! Не ведаю, хто канкрэтна прыдумаў праграму мастацкай часткі, але ён зусім забыўся, у якой школе мы вучымся. На шчасце дзяўчаты з музычнага калектыву заспявалі некалькі беларускіх песнь. Чарговы раз аказалася, што да мастацкай падрыхтоўкі спадарыні Бажэны Ляўчук не можна ніяк прычапіцца. Мерапрыемства закончыў канцэрт рок-гурту. Пасля намеснік дырэктара Аляксандр Лаўрыновіч падзякаваў вучням за падрыхтаваную ўрачыстасць.

Андрэй Грыгарук,
II „б" кл. Гімназіі ў Гайнаўцы

Дзённік Міколы

7. Ганг Лінкаў

Мы з Аняй не ўмелі знайсці адказ на загадкавы стукат у дзверы мастака. Ярак і Томак таксама нам не дапамаглі, іх не было ў хаце.

— Пайшлі ў падвал, — кінула нечакана Аня. — Там, мабыць, прыхаваны адказ на наша пытанне.

Скажу праўду — я спалохаўся: мы дзейнічалі паводле дзівосных схем. Раз беглі на гарышча — цяпер нас цягнула ў падвал. І мы пабеглі ўніз ды забыліся ўключыць святло.

— Мікола! Ці бачыш тое, што я бачу? — Аня падштурхнула мяне ў бок. — Глядзі, які ключ!

— Вой! — я аж падскочыў ад радасці. — Я думаю, што гэты ключ дапаможа разблытаць нашу загадку.

Мы падышлі да стала і я ўзяў у рукі ключ, а ён быццам компас паказаў нам кірунак на ўсход.

— Ён паказвае нам дарогу, — усміхнулася Аня, — пайшлі яго следам!

І мы пайшлі. Ішлі, ішлі, а вакол нас рабілася ўсё цямней і цямней. Наш ключ стаў свяціць залатым бляскам і асвятляць нам дарогу.

— Неяк страшнавата тут, — азваўся я дрыготкім голасам.

— Не наракай! — папракнула мяне Аня.

Раптам ключ спыніўся ля адных драўляных дзвярэй.

Аня засунула ключ у дзірку і перакрунула замок. Я не мог паверыць... У кутку сядзела ўся сям'я Ліняцкіх.

— Б-р-р-ры, — напалохалася і Аня. — Скажыце, спадарства, чаму вы тут... І што вы тут робіце?

— Хі-хі-хі, — засмяяўся адзін з хлопцаў.

— Ты лепш, дзяўчынка, заплюшч вочы і падумай, што табе гэта ўсё прыснілася, — прашыпеў як вуж стары Ліняцкі.

— І лепш уцякайце адсюль, пакуль мы яшчэ добрыя, — загадаў нейкі іншы голас з гангу Ліняцкіх. — Хутчэй! Пайшлі прэч!

Стары Ліняцкі пстрыкнуў пальцамі і мы з Аняй, мігам, апынуліся ў кватэры.

— Што здарылася з намі? — я глядзеў на Аню, а яна на мяне.

— Ці не замнога чарадзейства ў нашай камяніцы? — прашаптала Аня. Я толькі махнуў галавой. Хацеў чым хутчэй сустрэцца з Нор Узі, але праз акно я ўбачыў, што мастак якраз выйшаў з пад'езда.

Мы ўключылі тэлевізар і бяздумна глядзелі ў экран.

(працяг будзе)

(нак-с)



Польска-беларуская крыжаванка № 44

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 40: Шпак, Ас, аса, разраднік, цытра, Лі, дэкан, пан, малако. Працэс, гук, карта, сарна, вада, асілак, кіно.

Узнагароды, **запісныя кніжкі**, выйгралі: **Лукаш Габрылеўскі**, **Паўліна Мароз** і **Анна Раманюк** з ПШ у Новым Корніне, **Ілона Асіпюк**, **Ева Шырэнос** і **Раман Лушчынскі** з Бельска-Падляшскага. Віншуем!

Фота ЛІДЗІІ ПАНЬКОЎСКАЙ

Выступаюць вучні другога і трэцяга класаў

— Часта магло здавацца, што настаўніцкая праца бестурботная: прыйшоў, пасядзеў, пахадзіў па школе дый паехаў або пайшоў дадому. Аднак у сапраўднасці праца настаўніка не астаецца за дзвярамі школы. Настаўнік працуе круглы час, павышае веды, а гэта адбываецца калі-нікалі нават коштам уласных спраў.

Першымі выступілі вучні нулявога і першага класаў пад кіраўніцтвам выхавацелькі Бэаты Маркевіч; яны прыгожа праспявалі песеньку „Нашай пані". Пасля іх паказаліся вучні першага і другога класаў пад кіраўніцтвам выхавацелькі Лідзіі Панькоўскай.

— Nasza Pani lubi się śmiać, nasza

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Лідзія Панькоўская

Мы любім нашу настаўніцу, клас і ўсю школу

11 кастрычніка г.г. у Пачатковай школе ў Арэшкаве запанаваў узнёслы і радасны настрой. Вучні выступалі на сцэне, дэкламавалі, ставілі сцэнкі, спявалі і, наканец, гулялі на дыскатэцы. Усё гэта было прымеркавана да Дня настаўнікаў, у адрас якіх — за іх прызванне, ахвярнасць і веды — кіраваліся шчырыя пажаданні ды таксама — за сукупнасць навучальна-выхаваўчай працы — вылучэнні і ўзнагароды. Было вельмі святочна.

Святкаванні Дня нацыянальнай адукацыі ў гэтым годзе адбываліся паводле распісання Вучнёўскага самакіравання пад наглядам настаўніцы гісторыі Генрыкі Бліхаж, адобранага дырэкцыяй школы. Урокі ў той дзень праводзілі старэйшыя вучні пад наглядам настаўнікаў прадметаў. Урачыстая акадэмія адбылася ў гімнастычнай зале, упрыгожанай школьнай самаўправай. Гарачую падзяку запар з пажаданнямі далейшых поспехаў у працоўным і асабістым жыцці выказала настаўнікам дырэктарка школы Гражына Бэрэзняк. Уручаючы ўзнагароды і вылучэнні, сказала:

Pani ma oczy wesołe, my lubimy naszą Panią, i klasę, i całą szkołę, — прадэкламаваў уголас Крыстыян Дунда з другога класа. А песню сваёй настаўніцы праспявалі Марта Дэмянюк і Эвеліна Дунда ў суправаджэнні цэлага класа. Пасля дзеці танцавалі пад песеньку „Sto uśmiechów na minutę".

Далей выступалі вучні старэйшых класаў са скетчамі і песнямі пра вучняў і настаўнікаў. Пасля акадэміі вучні ўручылі сваім настаўнікам кветкі з пажаданнямі. Усхваляваны былі не толькі настаўнікі, але і прысутныя бацькі. Дырэктарка школы Гражына Бэрэзняк сказала:

— Ад свайго імя і Педагагічнай рады сардэчна дзякую вам і вашым бацькам за памяць пра нас у сённяшні дзень. Хочам таксама, каб вы пра нас памяталі не толькі сёння, але і штодзень. Каб вы заўсёды былі такія ветлівыя, мілыя. Каб кіраваліся не толькі тэмпераментам, але паводзілі сябе культурна і ветліва, па-чалавечы — у школе і па-за школай.

Міхал Мінцэвіч

Уладзімір Арлоў, Адкуль наш род

Паўстанне Тадэвуша Касцюшкі

Пачатак паўстання

Паўстанне пачалося ў сакавіку 1794 года ў старажытнай сталіцы Польскага каралеўства — Кракаве. Касцюшку абвясцілі начальнікам паўстання. Змагары хацелі выгнаць захопнікаў са сваёй зямлі і аднавіць незалежную Рэч Паспалітую ў яе ранейшых межах.

Хутка ўзялася за зброю і Беларусь. У адну з красавіцкіх начэй паўстанцы вызвалілі ад расійскіх войскаў сталіцу Вялікага княства Літоўскага Вільню.

Разам з іншымі змагарамі біліся з царскімі войскамі ўзброеныя косамі беларускія сяляне. Іх называлі касінерамі.

Паўстанцы спявалі „Песню беларускіх жаўнераў":

Помнім добра, што рабілі,
Як нас дзёрлі, як нас білі.
Докуль будзем так маўчаці?
Годзе нам сядзець у хаце!
Нашто землю нам забралі?
Пашто ў путы закавалі?

Дочкі, жонкі нам гвалцілі.
Трэ, каб мы ім заплацілі!
Коней нам пазаязджалі,
Што хацелі, то і бралі.
Пойдзем жыва да Касцюшкі,
Рубаць будзем маскалюшкі!

Маскалюшкамі называлі царскіх салдатаў-карнікаў.

Да паўстанцаў перайшла ўлада ў Горадні, Берасьці, Наваградку, Слоніме, Пінску, Ваўкавыску, Браславе, Лідзе, Ашмянах і ў іншых беларускіх гарадах і мястэчках. У сярэдзіне траўня былі вызвалены ўжо амаль усе землі Вялікага княства.

(працяг будзе)

Вужаў камень

Ад вёскі... у адлегласці дзвюх вёрст, быў узгорак ля дарогі, на ім ляжаў вялізны Вужаў камень. Старыя людзі гэтак аб ім расказвалі.

Раз улетку ў ціхую пагодлівую ноч ляцеў, агнём шыбаючы, вуж з поўначы на поўдзень, як бы несучы з сабой многа золата і срэбра грэшніку, які чорту душу запісаў. Бачылі гэта дарожнікі, ідучы з прыгону. Раптам адчынілася неба, светласць вялікая разлілася, людзі, молячыся, валяцца на зямлю, а вуж, выцяты нябеснымі косамі, валіцца на ўзгорак і пераварочваецца ў камень. Скарбы ж золата і срэбра, што нёс з сабой, там жа на месцы самі закапаліся ў зямлю і з таго часу з'яўляліся на розных месцах узгорка ў розных постацях. Адны бачылі плачку на камені, якая выцірала сабе слёзы насаткай, палючай агнём, другія — позна ідучы дарогай, углядалі карлюкоў чорных і тоўстых, як бочка, іншым з'яўляліся чорныя казлы, якія з зямлі скакалі на камень, а з каменя на зямлю, і шмат іншых дзівосаў.

Гукалі яшчэ, што калі хто асмеліцца ля Вужава каменя начаваць, то дастане гэтыя скарбы.

Белая Русь, легенды, паданні

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Тэатральны калектыў з Беластока ў пастаноўцы „Папялушка"

Хмарка

Лятала хмарка па небе раз хутка, раз памаленьку. Хмары і хмаркі сунуліся то туды, то сюды, як ветру падабалася. Малой хмарцы падабалася неба, вецер, сонца, іншыя воблакі і хмары і тое, што калярова расклалася ўнізе... Адно ёй не было даспадобы — была яна зусім маленькая. Было б весялей, каб захацела далучыцца хоць у пару да іншае хмаркі, якія самі гарнуліся да яе, прасіліся ў кампанію, ды здавалася ёй, што не гонар быць у гурце. Вось, тая хмарка большая за яе, а тая пукатая... Мабыць, прыгажэйшыя, больш паўнаводныя... Падбірала хмарка свае растрапаныя спадніцы, прыгладжвалася, то зноў старалася шырэй надзьмуцца, ушыркі раскінуцца, быццам, глядзіце, больш месца займае... І праўда, большала! Адчувала сябе цяжэйшай з кожнай кропляй, якой набіралася, паўнела.

— Вось якая я хмара! Яшчэ, яшчэ, яшчэ!.. А вы сабе і не думайце, што адстану ад вас! Я і хутчэй паплыву, і яшчэ большая буду! Я ўжо не воблачка! Яшчэ!!! — і разяўлялася хмара, і набіралася моцы...

Пашарэла неба, сонца цьмяна прабівалася праз разасланыя па небе хмары. Вецер тузаў за бакі, прадуваў спадсподу ды навылёт цяжкую хмару, якая старалася сціснуцца шчыльней. Хоць вецер гнаў яе хутка, адчувала свой цяжар і стому. А яшчэ набіралася вады з асобных кропляў. А і меншыя хмаркі сталі да яе туліцца, як да моцнае матулі, каб так страшна не было ганяцца паасобку па асеннім небе...

І не стрывала хмара, упусціла долу свае спадніцы. Высыпаліся шчодра кроплі, паляцелі, асірацелыя, уніз. Хмара з палёгкай уздыхнула: як добра! І адчула, што яе... амаль... няма! А пасля ўбачыла, што ўся яна, ва ўсіх сваіх кроплях — на чорнай астылай зямлі.

Міра Лукша

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Калектыў перад выступленнем у Орлі. У сярэдзіне, у чорнай кофце, Анна Баран

Калектыў песні і народнага танца Гайнаўскага дома культуры

Ужо дзевяць гадоў Гайнаўку і наваколле праслаўляе ў краіне і за мяжою Калектыў песні і народнага танца, які працуе пры Гайнаўскім доме культуры. Вядзе яго ягоная заснавальніца Анна Баран. Калектыў складаюць дзеці і моладзь гайнаўскіх школ.

Як сказала Анна Баран, узрост членаў калектыву розны, бо танцуюць у ім тыя, што хочуць танцаваць. Цяпер у складзе калектыву наступныя асобы: Лукаш Янюк (ПШ у Дубінах), Мая Бірыцкая (ПШ н-р 2 у Гайнаўцы), Адам Крукевіч, Ева Чыж, Анна Васько (Гімназія н-р 1), Юстына Карыноўска, Эля Ціханюк, Корнэль Гаго (Гімназія н-р 2), Марта Карвоўска, Войцех Вайткоўскі (Гімназія н-р 3 з беларускай мовай навучання), Эля Вось (Агульнаадукацыйны ліцэй) і Люцына Давідзюк (выпускніца Прафесійнага вучылішча).

Калектыў песні і народнага танца ўдзельнічаў у многіх мерапрыемствах у Гайнаўцы і наваколлі. Выступаў таксама ў Варшаве па запрашэнні Натолінскага асяродка культуры, Беластоку, Граеве, Цеханоўцы і Бельску-Падляшскім. Гастраліраваў таксама ў Беларусі і Швецыі. Шматразова калектыў прымаў удзел у Ваяводскім аглядзе дзіцячых і маладзёжных калектываў песні і танца ў Бельску-Падляшскім. Прадстаўляў ён Гайнаўку і ў мінулагоднім Цеханавецкім свяце хлеба, дзе атрымаў трэцюю прэмію.

27 ліпеня г.г. калектыў удзельнічаў у Міжпавятовым адборы конкурсу „У пошуках і перадачы фальклору" ў Нараўцы, адкуль прайшоў у IV прэзентацыі народнай традыцыі Падляшскага ваяводства, якія адбыліся 17 жніўня ў Беластоку, дзе атрымаў I узнагароду і заваяваў агромнае прызнанне публікі; там калектыў паказаў вязку беларускіх танцаў: лявоніху, крутуху, мітуся і польку-галопку. У сваім рэпертуары калектыў мае польскія народныя танцы і танцы рэгіянальныя: падляшскія, люблінскія, білгарайскія, курпёўскія, шлёнскія, цешынскія. Нядаўна калектыў папоўніў свой рэпертуар многімі беларускімі танцамі.

Поспехі Калектыву песні і народнага танца (а таксама маладзёжнага калектыву „Ілюзія") гэта заслуга не толькі яго членаў, але і мастацкага кіраўніка Анны Баран, якая з'яўляецца і загадчыкам, і харэографам, і касцюмеркай.

— Я вельмі люблю сваю працу, — гаворыць Анна Баран. — Яна супадае з маімі зацікаўленнямі і адукацыяй. Я штудзіравала культурна-асветную педагогіку ў Любліне, спецыялізуючыся ў народным танцы. Вельмі цёпла прыгадваю выступленне калектыву ў Варшаве, дзе нас успрымалі як „Мазоўша". Было вельмі цёпла і думаю, што наша моладзь разагрэла варшаўскую публіку.

Хацелася б мець, як кожны парадачны калектыў, розныя ўборы. Цяпер танцуем у падляшскіх уборах; думаю, што танцуем правільна, аднак не дае гэта візуальнага эфекту, бо, напрыклад, паланез трэба танцаваць у контушах, кракавяк — у кракаўскіх уборах, а беларускія танцы — у беларускіх.

Цешуся, што такая форма прэзентацыі фальклору ўзнікла ў Гайнаўцы. Хочацца, каб калектыў разрастаўся і тую народную культуру паказваў як найбольшай публіцы. Добра было б прыцягваць да гэтага дзяцей з маладых гадоў, бо тады ёсць надзея, што гэтая традыцыя астанецца ў іх і будзе перадавацца далей. Хацелася б выхаваць некалькі пакаленняў у традыцыі народнага танца.

* * *

Калектыў песні і народнага танца Гайнаўскага дома культуры аб'яўляе набор ахвотных у танцавальныя групы і ў новую вакальную групу ў наступных узроставых катэгорыях:

I — 6-8 гадоў,
II — 9-12 гадоў,
III — 13-16 гадоў.

Зацікаўленых просім звязвацца з Гайнаўскім домам культуры: вул. Беластоцкая 2, тэл. 682 3203 або 682 4808.

Сардэчна запрашаем!

Міхал Мінцэвіч

Дарагой **КАСІ ІВАНЮК** шчырыя спачуванні
з прычыны напаткаўшага яе гора
— смерці **МАМЫ** —
выказваюць сябры з III „б" класа Гайнаўскага белліцэя.

Паэтычнае Трохгалоссе

Серада, 16 кастрычніка, была днём паэзіі. Бельскі дом культуры ўжо трэці раз арганізаваў дэкламатарскі конкурс для вучняў пачатковых школ і гімназій. Большасць удзельнікаў склалі вучні бельскіх школ, але прыехалі таксама дзеці з Ягуштова, Орлі і Храбалоў.

У катэгорыі падставовых школ у конкурсе прынялі ўдзел 33 дзяцей. Шматлікую групу складалі вучні бельскай „тройкі", якія выступалі на польскай і беларускай мовах. Здзіўленне, але і радасць выклікаў факт, што вучні іншых школ, напрыклад, Пачатковых школ н-р 2 і 1, дзе дзеці не вывучаюць беларускай мовы, на конкурсе выступілі з беларускамоўнымі творамі.

Рэпертуар удзельнікаў быў розны і некаторыя з твораў выклікалі цяжкасці. Бжэхва, Каханоўскі, Аснык, Тувім, Міцкевіч — гэта найбольш папулярныя польскія паэты. З беларускіх — цікавасцю дэкламатараў карысталіся творы Максіма Багдановіча і Віктара Шведа. Дзецям падабаліся вершы Івана Шуцько, Уладзіміра Корбана, Алеся Барскага і Яўгена Крупенькі. Вучні Пачатковай школы н-р 4, дзе вывучаецца ўкраінская мова, дэкламавалі вершы Ігара Калынеця, Грыцька Байко і Тараса Шаўчэнкі.

У старэйшай групе 19 гімназістаў найбольшай папулярнасцю карысталіся вершы Віславы Шымборскай, Аляксандра Пушкіна, Тараса Шаўчэнкі, Надзеі Артымовіч і Віктара Шведа. Тэматыка вершаў была ўжо больш сур'ёзная. Праблемы штодзённага жыцця, каханне, туга па радзіме, патрыятызм паяўляліся вельмі часта.

Старэйшыя ўдзельнікі конкурсу дэкламавалі з большай вытрымкай, спакоем і вопытам. Інакш выступалі малодшыя дзеці.

Мартына Барташук, вучаніца III класа бельскай „тройкі" дэкламавала верш Эдзі Агняцвет пад загалоўкам „Балбатуха і ціхоня" і „Прыгоды блыхі Шахрайкі" Яна Бжэхвы. Дзяўчынка дэкламавала з такім перакананнем і эмацыянальнасцю, укладваючы цэлае сэрца ў дэкламацыю, што нават публіцы перадаваўся настрой старой Варшавы, у якой пражывала і гуляла з сяброўкамі Шахрайка. За выступленне дзяўчынцы прысвоена было трэцяе месца.

Фота ПАЎЛІНЫ ШАФРАН

Мартына Барташук

Гран-пры камісія ў складзе: Тамара Русачык, Ева Якубашак і Агнешка Фірсовіч, прысвоіла Рыгору Красоўскаму з бельскай „тройкі" за цудоўнае выкананне вершаў „Пра хлопчыка, папугая і кракадзіла" Мар'яна Дуксы і „Турнір" Збігнева Ленгрэна. Першае месца прыпала Эдыце Русіновіч з Орлі, другое Марце Вайцюк (ПШ н-р 3) і Альжбеце Коршак з Храбалоў, а трэцяе Мартыне Барташук (ПШ н-р 3), Еве Мартынюк (ПШ н-р 4) і Юльяне Дораш (ПШ н-р 3). Вылучэнні атрымалі сем асоб: Наталля Міранчук, Каміла Філіпюк, Магдаліна Якімюк, Матэвуш Магрук, Ева Сталеўская, Аляксандра Лаўранюк і Тамаш Таранта.

Сярод вучняў гімназій першае месца заняла Анна Пахвіцэвіч за дэкламацыю „Іконы" Віктара Шведа і „Драўляныя птушкі" Анны Каменскай. Другое раўнапраўнае месца занялі Лукаш Чыжэўскі і Аляксандра Багуцкая, а трэцяе месца прыпала Эвеліне Вайдакоўскай. Ева Карыцкая і Юльяна Шчурак занялі чацвёртыя месцы, а пяць асоб атрымалі вылучэнні (Аляксандра Коршак, Агнешка Смактуновіч, Сільвія Фалькоўская, Вольга Рыжык і Барбара Жэрунь).

Паўліна Шафран

Фільмавы вечар

У гэтым тыдні, калі кастрычнік задзіўляе нас зменным надвор'ем, калі ад холаду чалавек хаваецца ў цёплы куток, прапаную фільмы, якія дазволяць утульна правесці вечары.

„XXX" Роба Коэна спадабаецца ўсім аматарам баевікоў. Галоўны герой — Ксандэр Кейдж (у гэтай ролі Він Дызел) уганяе самаходы і з іх удзелам інсцэнізуе аўтакатастрофы, якія здымае і змяшчае ў Інтэрнэце. Аднойчы трапляе ён у рукі агента Гібсана (Самуэл Л. Джэксан), які прымушае Ксандэра прыняць удзел у тэстах па лоўкасці. Калі ўсё ўдаецца, Ксандэр атрымоўвае заданне паехаць у Прагу і перамагчы расійскую мафію, якой бос займаецца біялагічнай зброяй. Мае яна быць накіравана на ўсе вялікія гарады Еўропы дзеля звяржэння ўрадаў.

На экране паяўляюцца яшчэ Аліша Арджэнта, Мартон Чокас і Майкл Руф.

„Тайм-аўт" — французская кінакарціна рэжысёра Лаўрэнта Кантэта спадабаецца тым, якія без працы не ўяўляюць сабе жыцця.

Галоўны герой Вінцэнт (у ролі Аўрэлій Рэкон) бачыць сваю сям'ю толькі ў час уік-эндаў. Працуючы ў філіяле ААН у Жэневе — так думае, прынамсі, яго жонка Мур'ел (Карын Віярд). Пасля некалькіх месяцаў аказваецца, што Вінцэнт даўно ўжо страціў працу і стараецца скрыць гэта ад блізкіх. Адна хлусня спараджае другую, а як гэта закончыцца — варта даведацца.

„Галышы" — Вітальда Святніцкага здзіўляе адвагай і дурасцю людзей. Рэжысёр паказвае жыццё аднаго офіса, у якім ужо 50 гадоў нішто не мяняецца. Героі, калі забудзем, што па экране бегаюць голыя людзі, перажываюць добрыя і благія дні, п'юць каву, фліртуюць, пляткуюць. Сенсацыю выклікае раман адной з супрацоўніц, але, каб даведацца што было далей трэба пайсці ў кіно. На экране пабачым аматараў, якія добра справіліся са сваімі ролямі: Анну Пудлоўскую, Барбару Гансёр, Агнешку Пасько, Ірэну Каладзей і Вальдэмара Плотка.

Паўліна Шафран

Вера Касмовіч з Гарадзеі

Арыштаваная 14 студзеня 1949 года. Была асуджана на 10 гадоў пазбаўлення волі і 5 гадоў паражэння ў правах. У турме нарадзіла дачку. Адбывала пакаранне ў жаночым лагеры ў Кінгіры. Вызваленая 10 траўня 1956 г., рэабілітаваная ў 1967 годзе*.

Вера Касмовіч была пакарана за ўдзел у Саюзе беларускай моладзі.

* * *

Быў позні вечар і ў мястэчку многія ўжо спалі. Доўгі час мы не маглі адшукаць Чырвоназорачнай вуліцы. Нават міліцыянеры чухаліся ў голаў і не ведалі, што сказаць.

— А как па-рускі?

— Наверно Краснозвёздная, — прыдумаў Вячаслаў на хаду. Пра такую вуліцу таксама не чулі і наш шафёр пачаў падазраваць, што прыгналі яго пад неіснуючы адрас.

— Я ж лісты пішу на Чырвоназорачную, — не здавалася Лена.

Нехта параіў звярнуць у саўгасны квартал ля цукровага завода. Тут, пасля многіх роспытаў, мы адшукалі дом Веры Касмовіч. У хаце гарэла святло. Многія з нас ачунялі. Падумалі пра адпачынак у бяспечным кутку. Дарожная блуканіна і няўпэўненасць хутка загоняць у псіхічны тупік.

— Вам трэба было пытацца пра мяне, — гаспадыня ветліва запрасіла ў дом. — У Гарадзеі мяне ведаюць.

* * *

Вера Касмовіч упамінаецца ва „Успамінах" сясцёр Анелі Катковіч і Вераніцы Катковіч-Клентак.

Кніжка адкрывае жудасць бальшавіцкага тэрору, які сустрэў маладых людзей за ўдзел у СБМ. Вераніка Катковіч страціла ў ссылцы сынка. Нарадзіла яго ў турме і змагалася год часу за яго жыццё.

— *Пасля смерці Славіка сілы мяне зусім пакінулі і я была блізкая да маральнага зламання,* — піша Вераніка Катковіч. — *Лагерныя ўмовы, хаця вынішчаюць людзей фізічна, аднак ствараюць магчымасці маральнай селекцыі зняволеных. На шчасце, мяне акружалі сябры нядолі, беларускія дзяўчаты, стойкія псіхічна ды маральна. Дзякуючы ім мне ўдалося вытрымаць і гэтую пробу лёсу*.

Гаворка тут пра Веру Касмовіч, Надзею Дземідовіч і Жэню Шастак, сяброўак-юначак з СБМ.

Псіхічную і маральную стойкасць Вера Касмовіч захавала па сённяшні дзень. Яе дагледжаныя дом і агарод вылучаюцца на вуліцы і ў мястэчку. Яе ветлівасць і гасціннасць (а трэба дадаць, што прыбіліся мы, восем асоб, нечакана нанач, галодныя, брудныя і стомленыя) — мы адчулі як дар.

Вера Касмовіч (з дому Скачко) нарадзілася ў 1928 г. У 1942 закончыла 7 класаў і паступіла ў настаўніцкую семінарыю ў Нясвіжы. У час нямецкай акупацыі дзейнічала ў СБМ. Пасля вайны была вымушана працаваць (бацька памёр у 1939 г.). Пасля адпаведных курсаў у Баранавічах у 1945 г. працавала загадчыцай лабараторыі. У 1947 г. выйшла замуж за настаўніка Яўгена Касмовіча. Працавала бухгалтаркай у Гарадзеі. У 1949 годзе, на праваслаўны Новы год, арыштаваная. Была цяжарнай.

* * *

Сустрэча ў Гарадзеі задоўжылася далёка за поўнач. Яшчэ пасля нас у дом завіталі госці з Мінска — дачка з унучкай.

Вера Касмовіч расказала нам, як лёс ацаліў яе дачку. Нарадзіла яе ў мінскай турме „амерыканцы" — у кашмары допытаў, голаду і бруду.

— Прыехалі бацькі і пачалі мяне намаўляць, каб аддаць ім дзіця на выхаванне. Не хацела слухаць. Не магла ўявіць расстання з дачкой. Але розум перамог, і я аддала дзіця. Пасля гадоў зразумела гэта як шчасце; дзеці ў ссылцы паміралі ад голаду або прападалі без следу.

Пра лагер у Кінгіры расказвае сяброўка няволі Вераніка Катковіч:

— *У студзені 1951 г., пасля двух месяцаў кашмарнага падарожжа, я апынулася ў жаночым лагеры ў Кінгіры. Мяне адразу „запраглі ў ярмо". Адзін дзень у месяц быў вольны. Праца мая была цяжкая: земляныя выкапы пры пабудове мосту, па пояс у вадзе. Выгрузка вапны ці вугалю, разгрузка цэменту, што пранікаў у дыхальныя органы, у вочы і праз адзенне прыліпаў да спацелага цела. Разгрузка дрэва вымагала сілы і была вельмі небяспечнай. Панаваў голад...*

Вера Касмовіч шчасліва вярнулася на радзіму. Сёння сустракаецца са школьнікамі і расказвае ім пра лёс сваіх сяброў змагання.

* * *

Наш візіт у Гарадзею не быў выпадковы: нашы сябры Лена Глагоўская і Вячаслаў Харужы — рэдактары „Успамінаў", Анна Сабэцкая пераклала кніжку на польскую мову. Кніжка „падарожнічала" разам і служыла ў якасці падарунка. Усе абдараваныя кніжкай асобы выказвалі цікавасць да тэмы. Тэма сталінскіх рэпрэсій малавядомая ў Беларусі. Другая справа — нямногія беларусы адважыліся спісаць сваё перажытае для патомных. Прышываная ім латка „ворагаў народа", „беларускіх нацыяналістаў" дыскрымінавала іх у грамадстве.

Вера Касмовіч працавала бухгалтаркай і не адчула такой жахлівай дыскрымінацыі, як яе муж Яўген Касмовіч, таксама асуджаны за СБМ.

— Калі пачынаўся школьны год, мой муж не знаходзіў сабе месца, — успамінае. Яўгену Касмовічу забаранілі выконваць прафесію настаўніка. Адчуў тую забарону як чарговую ссылку, у гэты раз — на мяжу жыцця. Каб не патраціць псіхічнага здароўя, ангажаваў свае надарваныя сілы ў пчалаводства. І сёння, хаця няма яго ў жывых, гасцей тут частуюць мёдам. Менавіта з-за пчол завітала да маці дачка-інжынер з Мінска, якая пасля смерці бацькі прыняла на сябе пчаліны клопат.

— Вялікага прыбытку ад мёду сёння няма, — гэта сямейная справа.

У час, калі гаспадыня ў кухні гатавала нам смачны пачастунак, мы апавядалі пра пошукі вуліцы.

— А ведаеце чаму? — падмаргнула нам дачка пані Веры. — Бо гэта мама перахрысціла нашу вуліцу на Чырвоназорачную — каб было па-беларуску, бо афіцыйна вуліца завецца Красной Звезды!

Ганна Кандрацюк

*Анеля Катковіч, Вераніка Катковіч-Клентак, *Успаміны*, Беларускае Гістарычнае Таварыства, Беласток 1999.

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

60-годдзе прыхода ў Гайнаўцы

У гэтым годзе свята іконы Божай Маці „Нечаканая радасць", якое 13 кастрычніка адзначалася ў Свята-Троіцкім саборы ў Гайнаўцы, прымеркавана было да юбілею шасцідзесяцігоддзя праваслаўнага прыхода ў Гайнаўцы. Урачыстасці супалі з пяцігоддзем заснавання ў Гайнаўцы двух іншых праваслаўных прыходаў. Усяночнае багаслужэнне і Святую літургію ўзначаліў епіскап Гайнаўскі Міран, які служыць у саборы ўжо чатыры гады. Маліліся з ім цяперашнія і былыя прыхаджане, настаяцелі суседніх гайнаўскіх прыходаў — пратаіерэй Георгій Ацкевіч, пратаіерэй Леанід Шэшка і благачынны з Бельска-Падляшскага мітрафорны пратаіерэй Георгій Такарэўскі. Свяшчэннікі гэтыя раней служылі ў прыходзе, дзе зараз стаіць сабор.

Уладыку Мірана вернікі прывіталі з хрэсным ходам. Гайнаўскія белліцэісты на беларускай мове прасілі епіскапа памаліцца за беларускі народ. Настаяцель Свята-Троіцкага прыхода, мітрафорны пратаіерэй Міхаіл Негярэвіч прыгадаў гісторыю прыхода. У Гайнаўцы ў 1920-я гады жыло звыш 3 тысячы праваслаўных вернікаў, але не было самастойнага прыхода. Прыналежалі яны да парафіі ў Дубінах. У 1925 г. у прыватным будынку па вуліцы 3 Мая ўзнікла капліца Казанскай іконы Божай Маці. На багаслужэнні прыязджалі туды святары з Дубін і Новага Беразова (да астатняга прыхода прыналежалі жыхары вёсак Дольнае і Горнае, якія зараз з'яўляюцца вуліцамі Гайнаўкі). У капліцы адбываліся вянчанні, хрысціны і паховіны. Звыш шасцітысячная праваслаўная супольнасць Гайнаўкі ў трыццатых гадах хадайнічала перад гміннымі ўладамі аб атрыманні згоды на будову царквы, але безвынікова. У 1939 г. савецкія ўлады спынілі дзейнасць капліцы, перадаючы яе на жыллёвыя патрэбы. У чэрвені 1941 г. немцы дазволілі адкрыць часоўню ў доме па вуліцы Ліпавай і вернікі маліліся ў ёй да часу збудавання царквы. 26 мая 1942 г. узнік асобны праваслаўны прыход і яго настаяцель айцец Серафім Жалезняковіч разам з вернікамі перабудавалі адзін з дамоў надлясніцтва „Лясная", якія атрымалі ад нямецкіх улад, на царкву. 11 кастрычніка 1942 года адбылося пасвячэнне новапабудаванай царквы св. Мікалая, а два гады пазней асвяцілі нованапісаную ікону Божай Маці „Нечаканая радасць", якую памясцілі ў алтарнай частцы царквы.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

У 1954 годзе свята іконы „Нечаканая радасць" перанесена было на першую нядзелю пасля свята апостала Іаана Багаслова (9 X; 26 IX паводле старога стылю) і так засталося па сённяшні дзень. Са святам іконы Божай Маці звязаны важнейшыя здарэнні ў гісторыі прыхода: закладка краевугольнага каменя ў 1973 г. пад будову сабора, устанаўленне на ім крыжоў у 1978 г., першае багаслужэнне ў 1982 г. і канчатковае асвячэнне сабора ў 1992 г. Амаль дваццацігадовым будаўнічым сабора і настаяцелем Свята-Троіцкага прыхода быў мітрафорны пратаіерэй Антоній Дзевятоўскі (памёр у 1995 г.). Яго астанкі пакояцца ў ніжняй царкве сабора.

У пропаведзі настаяцель Дубінскага прыхода, пратаіерэй Васілій Негярэвіч напомніў вернікам гісторыю іконы „Нечаканая радасць" і прасіў шчыра маліцца перад яе гайнаўскай копіяй, на якой нядаўна пазалацілі ківот. Чалавек прадстаўлены на іконе перад воблікамі Божай Маці і Хрыста многа разбойнічаў, але адначасна маліўся перад іконай да Багародзіцы. Хрыстос памілаваў яго за малітвы да Сваёй Маці і стаў ён праведным чалавекам, даючы прыклад для пераймання. Пасля малебна да вялікай іконы „Нечаканая радасць" і меншых, прывезенай з Масквы і напісанай у мінулым годзе, якія ляжалі на аналоях, прыкладаліся свяшчэннікі і вернікі гайнаўскіх і суседніх прыходаў. Кожную другую пятніцу перад іконай служыцца акафіст да Багародзіцы. Многія вернікі пасля малітваў перад іконай атрымліваюць духовую падтрымку.

Аляксей Мароз

Фота ЕЖЫ САМУСІКА

Царква ў Пухлах

Якая цікавая Беласточчына! — не можа надзівіцца наш доктар, які бачыў ужо мо паўсвету.

„Z panem Naumiukiem jestem w dużej przyjaźni...”

(заканчэнне; пачатак у папярэднім нумары)

Плывучы па рацэ Нарве, мы захапіліся драўлянымі цэрквамі па дарозе, гаворыць доктар Самусік.

Царква ў Нарве, якую пабудавалі яшчэ раней, чым каталіцкі касцёл, была пастаўлена ў 1518 годзе князем Іванам Вісьнявецкім. Да нашых часоў ні царква, ні касцёл не пратрывалі ў нязменнай форме. Сённяшняя царква Уздзвіжання Крыжа Гасподняга была пабудавана ў 1881-1885 гадах. Тады ў ёй апынуліся значна старэйшыя іконы Божай Маці „Усіх смуткуючых Радасць” і святога Антонія Пячэрскага, а таксама цудоўны іканастас. Нічога з гэтага ўдзельнікам сплыву на рацэ Нарве не давялося ўбачыць, бо ўсё гэта згарэла ў красавіку 1990 года. Знешнія сцены храма хаця былі драўляныя, не згарэлі і пасля пажару былі памаляваны ў часе рамонту яркай зялёнай фарбай, якая вельмі гарманізуе з навакольнымі дрэвамі. Царква стаіць крыху далей ад рэчкі, адразу за рынкам і выглядае імпазантна.

На невялікім узгорку, на якім стаіць сёння царква Пакровы Божай Маці ў Пухлах, расла калісьці велізарная ліпа. У яе цені жыў у шалашы стары чалавек, у якога пухлі ногі і ён не мог хадзіць. Аднойчы, калі ён маліўся пад дрэвам, убачыў на вярхушцы ікону Божай Маці і праз хвіліну паздаравеў. Ад таго часу гэта месца сталі называць Пухлы ад слова, якім мясцовыя жыхары называлі апухлыя ногі і рукі.

Другі раз, расказвае доктар Е. Самусік, ікона Пакровы Божай Маці мела паказацца крыху пазней. Паказалася яна на той самай ліпе жыхарам вёскі, просячым у супольнай малітве абараніць іх ад мясцовага пана, які прымушаў іх перайсці на грэка-каталіцкую веру. Жыхары Пухлоў былі пераканы, што ікона Божай Маці паказалася дзеля таго, каб даць ім знак, што не пакінула яна свайго народа і ўмацуе іх у праваслаўнай веры.

На ўзгорку каля царквы расце далей вялікая ліпа, але гэта ўжо не тое дрэва, на вярхушцы якога паявілася ікона Пакровы Прасвятой Багародзіцы. Тае ліпы ў XIX стагоддзі ўжо не было, але застаўся ад яе адростак, які праз два стагоддзі зноў стаўся магутным дрэвам.

Слухаю доктара Е. Самусіка і думаю: во, каб хоць дзесятая частка тых, што плаваюць па рэках на байдарках, мела такія зацікаўленні... Шкада, што не давялося нам убачыць царкву на могілках у Козліках, гаворыць доктар і падарожнік. Шкада, што мы там не пабывалі, а толькі праплылі побач.

Як і раней, доктар Ежы Самусік пісаў сёлета ў двухмесячнік „Zabytki”, у месячнік „Spotkanie z zabytkami” і ў месячнік „Poznaj swój kraj”.

У чэрвеньскім нумары часопіса „Poznaj swój kraj” аўтар змясціў артыкул „W małym miasteczku nad Nurcem” — пра Цехановец, дзе найважнейшай пазіцыяй для наведвальніка з'яўляецца Музей сельскай гаспадаркі імя Кшыштафа Клюка, які быў створаны дзякуючы Таварыству сяброў Цеханоўца ў 1979 годзе. Дырэктарам ад пачатку быў Казімір Ушынскі. У гэтым музеі найцікавейшы — скансэн, які складаецца са старых драўляных будынкаў, перанесеных з памежжа Мазоўша і Падляшша.

Якая цікавая Беласточчына! — не можа надзівіцца наш доктар, які бачыў ужо мо паўсвету. Вось мясцовасць Тыборы-Камянка, што ляжыць між Замбровам і Высокім-Мазавецкім. Тут жа нарадзіўся вядомы польскі вучоны — этнограф Зыгмунт Глогер. У добра захаваным будынку змяшчаецца сёння архіў выданняў Польскай акадэміі навук.

У „Zabytkach” nr 3 за гэты год паявіўся артыкул Ежы Самусіка „Barokowy ogród Branickich”, у якім можна прачытаць пра стварэнне гэтага гістарычнага парку і пра тое, што цяпер у ім дзеецца. А справа ў тым, каб паказаць наш парк такім, якім ён быў у XVIII стагоддзі. Калі гэта ўдасца, то парк пры палацы Браніцкіх у Беластоку можа трапіць у спісак Сусветнай спадчыны культуры і стане адным з найпрыгажэйшых паркаў у стылі барока не толькі ў Польшчы.

Летам доктар паслаў свае фатаграфічныя працы на конкурс у Быдгашч. Тэма была: „Польскі арыент”. Нядаўна ён атрымаў вестку, што прысудзілі яму першую ўзнагароду, а было там дзесяць здымкаў пра беларусаў і татараў. З „беларускіх” здымкаў: фрагменты царквы ў Трасцянцы, царква ў Ласінцы, прыдарожныя крыжы ў Сацах, каплічка ў Ахрымавічах. З „татарскіх”: могілкі і мячэць у Крушынянах.

Пра „трохвугольнік”: Трасцянка, Сацы і Пухлы доктар Е. Самусік напісаў у часопісе „Poznaj swój kraj” новы артыкул: „Kraina otwartych okiennic”. На Нарву прыязджаюць з Еўропы аматары падглядаць птушак. Праваднікамі іх былі члены Паўночнападляшскага таварыства аховы птушак. І яны заўважылі, што прыезджыя былі больш зацікаўлены тутэйшымі хатамі, чым птушкамі.

Нічога дзіўнага, такой архітэктуры яны нідзе ў Еўропе не бачылі. Дык яны прыдумалі праграму „Краіна адкрытых акаціц”, а грошы на яе дае Міністэрства аховы прыроды Даніі. Дамы адноўлены, вельмі прыгожа памаляваны, а асабліва экспануюцца драўляныя акаціцы і розныя іншыя драўляныя ўпрыгожанні на хатах.

Праграма ахоплівае ахову мясцовых традыцый і звычаяў, асабліва вёскі-шарангоўкі.

„A z panen Naumiukiem jestem w dużej przyjaźni”, — сказаў у задуменні мой субяседнік.

Ада Чачуга

Фота ЕЖЫ САМУСІКА

Лодкі на ваду! (злева — Кацярына Самусік)

Руская трагедыя

Гэта здарылася летам 1944 года, калі рускія гналі немцаў на захад. На Бахматах, дзе цяпер слаўнае вадасховішча, стаяла савецкая ваенная часць і байцы адтуль наведвалі Дубічы-Царкоўныя. Сярод іх вылучаўся культурнымі паводзінамі малады баец Андрэй родам з-пад Варонежа. Быў ён ваенным урачом і калі людзі даведаліся пра гэта, не давалі яму адгулу. Вядома, у ваенны час і акупацыю з лячэннем было цяжка. І той Андрэй вылечыў ад хвароб многіх людзей, у іх ліку і майго суседа Дзмітрыя Беляўца, які тады яшчэ быў падросткам.

У той час бацюшкам у Дубічах быў васточнік Дзмітрый, які жыў у дзяковай хаце побач згарэўшай у 1941 годзе царквы. У бацюшкі былі дзве прыгожыя дачкі; у адну з іх закахаўся ўрач Андрэй і часта наведваў яе. А ў Елянскім лесе, за Грабаўцом, стаяла іншая савецкая ваенная часць і адтуль байцы таксама наведвалі нашу вёску. І адзін радавы баец з тае часці таксама ўлюбіўся ў тую самую бацюшкаву дачку, што і ўрач Андрэй.

Каханне часта прыводзіць да драмы, бо сапернікі рэдка мірна пагаджаюцца. У царскі час дваране забіваліся ў дуэлях, а галота з-за вялікага кахання забівала ад рукі. Так сталася і з гэтымі байцамі. Андрэй быў чалавекам культурным і таму стаў ахвярай, бо баец з Елянскага лесу застрэліў яго ў бацюшкавай хаце. Адцягнуў яго ў бэзавыя кусты побач, якія там растуць да сёння, а свой пісталет разабраў на часткі і кінуў у кусты каля рэчкі.

На другі дзень усё выявілася, падняўся шум і ваенны пракурор са спецпадраздзяленнем заняліся гэтай справай. У злачынцы знайшлі таксама разабраны пісталет і з месца адбыўся ваенны суд. Адны гавораць, што забойцу расстралялі недзе ў лесе, а паколькі ніхто з байцоў не хацеў страляць у свайго таварыша, зрабіў гэта падростак, сын палка. Іншыя гавораць, што забойцу паслалі на перадавую лінію на пэўную смерць.

Пасля гэтай трагедыі бацюшкавы дочкі збеглі да партызан. Урача Андрэя з гонарам пахавалі амаль у тым самым месцы, што і загінуў, каля царквы. Камандзір сказаў палымяную прамову, гаворачы, што загінуў з рукі нямецкага акупанта...

Ніхто ў нас не ведаў прозвішча Андрэя, камандзір і байцы нікому пра гэта не сказалі і не пакінулі на магіле ніякага надпісу. А недзе ў 60-я гады нашы людзі на магіле Андрэя паставілі крыж з рускім надпісам: „Врач Андрей, погиб трагической смертью летом 1944 г.” І гэта ўсё. Недалёка ад гэтай магілы пахаваны і другі савецкі баец, які ў той жа час ва ўрочышчы Туркі нешчасліва трапіў пад гусеніцу танка, калі з біклажкай вады хацеў на яго ўскочыць; ягонага імя і прозвішча ніхто не ведае.

Нашы людзі апякуюцца магіламі гэтых нешчасліва загінуўшых байцоў. Не ведаюць, адкуль яны былі, а сем'і салдат не ведаюць, дзе яны пахаваны. Мо ўсё ж такі ў нейкіх ваенных архівах захаваліся звесткі пра іх...

Мікалай Панфілюк

Абманулі нас, маці...

Пад канец верасня старэйшыя жыхары Бельска былі прыемна здзіўлены, калі атрымалі элегантныя запрашэнні на шампанскае ў рэстаране „Гайдучэк". У праграме спаткання можна было прачытаць, што кожнае сужонства атрымае падарунак варты 100 зл., а да таго будзе яшчэ магчымасць выйграць узнагароду за 500 зл.!

Пятніца, гадзіна 19[30]. У рэстаран „Гайдучэк" заходзяць людзі пераважна ва ўзросце 45-80 гадоў. Дзе-нідзе можна пабачыць маладых людзей, якія па намове дзедка ці бабулі прыйшлі на спатканне. Гасцей вітае малады мужчына са шчырай усмешкай і шампанскім у руках. Данель Оўст з фірмы „Ванель" з Познані прадстаўляе бяльшчанам галоўны пункт праграмы — ваўняную пасцель. І з гэтага моманту вядучы роўна 2,5 гадзіны пераконваў сабраных у тым, што купля гэтай пасцелі акажацца найлепшай здзелкай жыцця.

Даваў ён гарантыю на 5 гадоў, але пасцель будзе служыць даўжэй: 10 а нават 20 гадоў. „А мыць яе трэба толькі раз на два гады!" — захапляўся вядучы. Бяльшчане яшчэ даведаліся, якія хваробы пагражаюць ад спання ў звычайнай пуховай пасцелі: астма, інсульт, рэўматызм. А гэта ўсё з-за пер'я, якое з'яўляецца рассаднікам бактэрый і іншых мікробаў. На ўсе хваробы ёсць аднак рада — ваўняная пасцель! Але цана пасцелі ашарашыла сабраную публіку. Аднаспальны камплект з воўны мерыносаў каштаваў 2 150 зл. „А ці здароўе не з'яўляецца бясцэнным?", — спытаў адразу Данель Оўст і дадаў: „Каб сужонства не сварылася за коўдру, двухспальная пасцель каштуе толькі 2 097 зл.! Самі бачыце, аказія!

Для багацейшых прапанавалася пасцель з кашміру за 3 520 зл. (аднаспальная) і 4 560 зл. Вядома, што такіх грошай ніхто не носіць пры сабе і таму пасцель можна было купіць у растэрміноўку. „Дарагія! Што ж, можна купіць за 3 зл. у дзень, — пытаў рытарычна Оўст, — бо столькі трэба плаціць за пасцель кожны дзень".

Каб падмацаваць словы аб дабрадзейным уплыве пасцелі, вядучы спаслаўся на сертыфікат якасці, якога не хацеў пазней паказаць (адказаў толькі, што пайшоў ён між людзей). Але ахвотныя купіць пасцель знайшліся. Каля 10 сужонстваў!

Аднак падаркі не ўсе атрымалі. Вядучы з усмешкай гаварыў, што нідзе на спатканне не прыйшло так многа людзей як у Бельску. Пастанавіў ён справядліва ператасаваць талоны з прозвішчамі ўдзельнікаў спаткання, сярод якіх меў вылучыць у выніку жараб'ёўкі ўзнагароджаных. Было іх каля 20 асоб, а падаркамі за 100 зл. аказаліся невялікія апараты для масажу пазваночніка. На гэтым закончылася спатканне ў „Гайдучку", а яго ўдзельнікі, якія не атрымалі абяцаных у запрашэннях падарункаў, выходзілі з рэстарана з маркотнымі мінамі. „От, і абманулі нас, маці", — сказаў да жонкі адзін з удзельнікаў спаткання.

Паўліна Шафран

Новая крама

У вёсцы Чаромсе пачала працаваць фірменная крама Сувальскага птушынага прадпрыемства. Выбар лакалізацыі не быў выпадковы. Крама знаходзіцца пры скрыжаванні дарог Кляшчэлі — Полаўцы (пагранічны пераход) і будавалася для абслугоўвання беларускіх пакупнікоў. Працуе яна кругласутачна. У краме вялікі асартымент мясных вырабаў. Пастаўка тавару штодзённая. Цэны ў параўнанні з чаромхаўскімі меншыя злоты-два на кілаграме. Таму многія чарамшане прыязджаюць сюды. Я сам еду за пакупкамі ў гэту краму, хоць з Кузавы да яе за два кіламетры.

У новай краме атрымалі працу сем мясцовых беспрацоўных. Для чаромхаўскіх прадпрымальнікаў фірменная крама з'яўляецца канкурэнтнай установай, асабліва для кляшчэлеўскай „Нітэрвы", дзе дагэтуль госці з Беларусі забяспечваліся мяснымі вырабамі. Кліенты з таго цешацца, паколькі маюць магчымасць выбару добрага і свежага тавару пры невысокіх цэнах. Больш бы такіх гандлёвых пунктаў вырастала ў чаромхаўскім наваколлі. Ды не толькі з харчовымі прадуктамі і мяснымі вырабамі. Шкада толькі, што мясцовыя купцы дазваляюць прыезджым „рабіць бізнес", а самі не выкарыстоўваюць такога шанцу.

Уладзімір Сідарук

Нарваўская дэмаграфія

У Нарваўскай гміне Гайнаўскага павета пражывае 4 626 чалавек, у тым у самой Нарве — 1 532. Апрача Нарвы найбольшымі вёскамі з'яўляюцца Трасцянка, Тыневічы-Вялікія, Ласінка, Крывец і Макаўка.

— У гэтым годзе ў гміне нарадзілася 31 дзіця, згулялі трынаццаць вяселляў і памерлі ажно 64 асобы. Залатое вяселле ладзілі 23 пары. 60-годдзе шлюбнага сужыцця адзначылі дзве пары: адна з Адрынок і адна з Анцутаў.

Сярод імён, якія давалі бацькі сваім нованароджаным дзецям, найбольш папулярнымі былі Бартош, Андрэй, Матэвуш, Якуб, Габрыела, Вікторыя і Наталля, — паінфармавала кіраўнічка ЗАГСа Галена Асташэўская.

Найстарэйшымі жыхарамі Нарваўскай гміны з'яўляюцца Мар'я Сільвяструк з Крыўца, якой 99 гадоў і Мар'я Астапкевіч з Макаўкі (нарадзілася яна ў 1905 годзе) ды Анна Алексяюк з Сацоў, Вера Кананчук і Ян Тайгунаў з Трасцянкі (усе яны народжаныя ў 1907 годзе).

Сёлета на тэрыторыі гміны прапісаліся 22 асобы, а выпісаліся — 59 асоб.

Янка Целушэцкі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Ваявода Марэк Стшалінскі (другі злева) і павятовыя ўлады: (злева) стараста Уладзімір Пятрочук, старшыня Рады Вольга Рыгаровіч і яе намеснікі Мікола Міхалюк і Мікола Бушко

Падвялі вынікі працы

З удзелам ваяводы Марка Стшалінскага 8 кастрычніка ў Беларускім музеі ў Гайнаўцы адбылося апошняе пасяджэнне радных Гайнаўскага павета. Ацанілі яны выкананне пастаноў „Стратэгіі раўнаважанага развіцця Гайнаўскага павета да 2015 года", якая прынята была два гады раней. У сесіі прынялі ўдзел жыхары Гайнаўшчыны, якія працавалі над стварэннем стратэгіі. Прадстаўнікі Саюза кансультантаў „Амбрэля" прадставілі параўнанне Гайнаўскага павета з іншымі паветамі.

Гайнаўскае староства прадставіла пісьмовую ацэнку выканання стратэгіі. У ёй звяртаецца ўвага на новыя адукацыйныя прапановы (аддзяленне Політэхнічнага інстытута, гімназія з дадатковым навучаннем беларускай мовы, новыя адукацыйныя спецыяльнасці, у тым ліку агратурызм, эканомія і рахункаводства). На Гайнаўшчыне палепшылася тэхнічная (цвёрдыя паверхні на 56 км павятовых дарог, каналізацыя і водаправоды ў гмінах) і сацыяльная інфраструктура (аддзяленні ў Гайнаўскай бальніцы, аддзяленне бельскага суда і цэнтр дапамогі для сям'і), развіваліся турызм, супрацоўніцтва з беларускімі і нямецкімі партнёрамі, папраўлялася ахова асяроддзя. Стараста Уладзімір Пятрочук заявіў, што не атрымалася супрацоўніцтва з прадпрымальнікамі. Заснаваная Гайнаўская гаспадарчая палата не распачала сваёй дзейнасці і людзі, якія жывуць з турызму, не праявілі ахвоты гуртавацца. Выключэннем з'яўляецца Агратурыстычны саюз „Зубр", да якога належаць уласнікі агратурыстычных кватэр. Стараста прапанаваў стварыць прафесійны павятовы калектыў па рыхтаванні праектаў, з якімі жыхары, прадпрыемствы і гмінныя ўстановы будуць звяртацца да еўрапейскіх фондаў за дапамогай. На думку старасты, будучыня Гайнаўскага павета будзе залежаць ад развіцця турызму, прадукцыі здаровага экалагічнага харчавання і яго экспарту, напрыклад, у Ліхтэнштэйн, квартал Берліна, з якім Гайнаўшчына супрацоўнічае. Стараста заклікаў войтаў і гмінных радных супольна вырашыць гаспадарку адкідамі.

Выкананне стратэгіі сустрэлася з заўвагамі. Былы бурмістр Ядвіга Рудзінская-Патэюк заявіла, што справаздача прадстаўлена павярхоўна. Няма ў ёй, напрыклад, інфармацыі аб будове Беларускага музея, якую прадбачвалася закончыць да 2002 года або інфармацыі аб стыпендыях для вучняў. Войт Нарваўскай гміны Якуб Садоўскі і радны Віктар Рэент лічаць, што ў стратэгіі павінна быць намнога больш прапаноў чым плануецца іх выканаць, бо сродкі з фондаў на рэалізацыю праектаў самаўрадаў і прадпрыемстваў можна атрымаць толькі тады, калі тыя прадугледжаны стратэгіяй развіцця рэгіёна. Радны Васіль Дамброўскі сказаў, што гайнаўскія ўлады мала ўвагі адводзяць зацікаўленню вонкавых інвестараў адкрываннем новых прадпрыемстваў у горадзе. Уладзімір Паскробка раіў карыстацца сыравіннымі рэсурсамі Белавежскай пушчы і развіваць супрацоўніцтва з прадпрыемствамі з усходніх краін. Мікола Бушко прапанаваў перанесці бліжэй цэнтра горада бюро турыстычнай інфармацыі аб рэгіёне. Сакратар Павятовай управы БГКТ Міхал Голуб заўважыў, што не ўдалося адкрыць прадбачанай у стратэгіі мастацкай школы, у якой маглі б рыхтавацца таксама інструктары для працы з беларускімі дзеткамі, моладдзю і вясковымі калектывамі.

У прадстаўленым саюзам кансультантаў „Амбрэля" параўнанні можна было заўважыць, што ў Гайнаўскім павеце добра ахоўваецца прырода, добры доступ жыхароў да кватэраў і менш беспрацоўных чым у іншых паветах. Аднак, многія маладыя людзі выязджаюць за працай у вялікія гарады і старэецца мясцовае грамадства.

Галоўныя задачы прадбачаныя для рэалізацыі на 2003-2006 гады ў Гайнаўскім павеце прадстаўлены даволі агульна: пачатак газіфікацыі рэгіёна, вырашэнне гаспадаркі камунальнымі адкідамі, пачатак будовы крытага басейна ў Гайнаўцы, развіццё турызму паабапал мяжы з Беларуссю. У планах стварэнне павятовага фонду крэдытных паручыцельстваў, рэалізацыя праграмы экалагічнай сельскай гаспадаркі, прадукцыі здаровага харчавання і фінансавае ўспамаганне мясцовых ініцыятыў.

Аляксей Мароз

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://republika.pl/niva_bielastok/*
E-mail: *niva_bielastok@poczta.onet.pl* альбо: *niva_bielastok@skrzynka.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2003 r. upływa 5 grudnia 2002 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na I kwartał 2003 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 115,00; pocztą lotniczą Europa — 127,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 153,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 12401053-40060347-2700-401112-005.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta PBK S.A., I Oddział Białystok, 11101154-401150015504.

Н!ўка

СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ

(...) И вот тут последовал следующий удар. Как только было подписано соглашение о партнерстве с социал-демократами и „Унией труда", в рядах форума неожиданно возник раскол. Евгений Вапа, возглавлявший одну из белорусских структур форума, заявил о несогласии с единой коалицией.

Сейчас ситуация почти анекдотическая: форум агитирует за своих кандидатов-белорусов, Вапа — за своих, тоже белорусов... Избиратели дезориентированы, голоса растянуты, кандидаты от нацменьшинств „взаимоуничтожаются". Абсурд? Нет, скорее, тонкая политическая игра.

Дело в том, что входящие в форум объединения выступают, как рассказал мне Ян Сычевский, за активизацию контактов с соседями, прежде всего с Беларусью. Польские белорусы считают, что сегодня эти отношения „занядбаныя" и, войдя во власть, собираются исправить эту ошибку. Напротив, у „раскольника" Евгения Вапы, по всей видимости, иные планы. Во всяком случае, от него в телефонном разговоре мы ничего нового не услышали: в Беларуси, дескать, нет демократии. Право, веет нафталином от таких сентенций, да и только...

Серьезные аналитики, с которыми мне довелось обсуждать эту ситуацию, сходятся во мнении: раскол спровоцирован для того, чтобы не допустить белорусов из форума во власть. А это значит, изолировать те политические силы в Польше, которые выступают за сближение с нашей страной. (...)

Игра в подкидного. Скандал на местных выборах на Белосточчине, „Советская Белоруссия", № 248 (21 623), 25.10.2002 г.

Сначала Метек, позже Яшка, а наконец то и Алесь Лукашенко вмешался во внутренние дела тоже-белорусов Польши — запомним

Крыжаванка



Гарызантальна: 4. паведамленне, 7. польская сталіца, 8. Дыега, мексіканскі мастак (1886-1957), 9. партугальская сталіца, 10. аб'ява пра распродаж білетаў на спектакль, 14. горад у Кеніі на паўночны захад ад Найробі, 18. выкананне шляхам вязання, 19. не адно ходзіць, а бяду за сабою водзіць, 20. невысокі скураны абутак на шнурках (адз. лік), 21. пяць коп.

Вертыкальна: 1. частка Ньюфаундленда або райскі востраў з кельцкіх легенд, 2. распалены попел, 3. усходні струнны шчыпковы інструмент грушападобнай формы, 4. балгарскі порт, 5. заліў у заходняй частцы Азоўскага мора, 6. ручная прылада для драблення цвёрдай пароды або лёду, 11. іспанская правінцыя з Памплонай, 12. уральская рака, левы прыток Таўды, 13. ускапаная палоска зямлі ў агародзе, 15. паўднёваазіяцкае ядавітае дрэва сямейства тутавых, 16. польскі трактар, 17. горад на захадзе Бранскай вобласці.

(Ш)

Рашэнне крыжаванкі складуць літары з пазначаных курсівам палёў. Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку з 37 нумара

Гарызантальна: купал, каралеўна, прыма, абсяг, вяз, багацце, акарына, Кан, аймак, Бюлер, Каледонія, Сідра.

Вертыкальна: спальня, кірза, ляўша, крывасмок, Аўстралія, пчала, гонар, век, Зан, алідада, Колас, бонза.

Рашэнне: **Змяняюцца не ўладары, толькі прозвішчы**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Запрашэнне на канферэнцыю

Беларускае гістарычнае таварыства, Кафедра беларускай культуры Беластоцкага універсітэта і Музей скульптуры ім. Альфонса Карнага ў днях 7-8 лістапада 2002 г. арганізуюць навуковую канферэнцыю „Беларускае культурнае жыцьцё ў II Рэчы Паспалітай". З дакладамі выступяць навукоўцы з Беластока, Варшавы, Мінска, Гродна, Брэста і Вільні.

7 лістапада (чацвер) — канферэнцыя пачнецца ў 10 гадз. у Музеі скульптуры ім. Альфонса Карнага у Беластоку, вул. Сьвентаяньская, 17, з адкрыцця выставы „Беларускае мастацтва ў II Рэчы Паспалітай". Першы дзень канферэнцыі завершыцца канцэртам беларускай музыкі міжваеннага перыяду ў выкананні Таццяны Цыбульскай і Таццяны Лазуткінай з Мінска, які пачнецца ў 18^{30} у Комплексе музычных школ імя І. Я. Падэрэўскага ў Беластоку, вул. Подлесьна, 1.

А 8 лістапада (пятніца) канферэнцыя прадоўжыць працу ў Беластоцкім універсітэце, вул. Лінярскага, 4.

Нясмешныя акрайчыкі

Хопіць палітыкі. Хоць, калі можна, да перыяду выбарчай цішы варта было паўдзельнічаць у такой дзейнасці. Папляткарыць прынамсі. Пра сябе, пра іншых. Бо калі сам сябе не пахваліш, дык ходзіш увесь дзень як апляваны. А не так пахваліш каго ў газеце, дык таксама нядобра. Чытач, праўда, зразумее ўсё. Каго хваляць, каго ганяць, з чаго жартуюць... Чытач ёсць інтэлігентны. Горш бывае з героем. Герой, бывае, чытае між радкамі, кпіну шукае. На здымку не ўсе свае медалі бачыць. На фоне — лішнюю худую карову, сабачак у непрыстойнай сітуацыі ці чужую руіну (падумаюць, што развалюха, не дай Бог, твая!). Альбо яшчэ горш — калі ты чалавек публічны, дык глядзі! — заўсёды можаш трапіць у фотааб'ектыў якраз на першую старонку, калі раптам ткнеш пальцам каля свае ноздры. І пасля нават твае найлепшыя сябры прычэпяць табе мянушку „Калупайла". І хоць цябе на слуп з аб'явамі павесяць на вялікім партрэце, лепш ужо каб табе вочы на ім выдзіралі ці дамалёўвалі вусы, акуляры ды асліныя вушы, чым каб прахожаму ты асацыяваўся з тою калупкай. Дарує народ першаму пану ў *панстве*, калі кульне лішнюю чарку або на несваю кабетку пільней гляне, бо што за фацэт быў бы без такіх фацэцкіх заган! Нават у чымсьці бліжэй сэрцу стаў, калі такі, як усе... Ды як калупацца, хоць ва ўласным носе навідавоку, калі пра маральную чыстасць гаворыш?!

Цяжка быць публічнай асобай. Скажаш што ў палемічным шале — па судах валочаць. Трэба пасля казаць, што добра хацеў. А вылез у людзі — умей быць дыпламатам. Будзь карэктным палітычна. Заткні дзіркі ў носе (хоць смярдзіць), надзень чорныя шоры ля скроняў, каб не бачыць таго ўсяго збоку, заканапаць вушы (прынамсі адно), каб не чуць замнога і не мець сумненняў...

Сяджу сабе перад каміном у хаце майго сябра, што прымаў удзел у выбарах, і падкідаю ў агонь то адно паленца, то другое. Цёпла. Не азываюся, бо чаго. Памаўчаць час ад часу трэба, асабліва сярод мужчын. Дарэчы, хопіць палітыкі. Хопіць выбіраць. Хоць выбіраеш кожны дзень. Хіба ж выбярэш сухую булку хлеба, калі не любіш есці сухі? А хто такі есці схоча! Хай цябе хто і не думае падмануць — ляжаць боханы хлеба, на від харошыя, румяныя, добраспечаныя, з добрае мукі — ты ж і так не возьмеш, не праверыўшы. Папольску гэта лепш гучыць, той ці то заклік, ці заахвочанне, ці пагроза, ці выказанне крыўды *pieczywa dotkniętego*, якое мусова ўжо купіць, калі за яго ты ўзяўся. Дык чаму ў палітыцы... Што я казаў?!! Хопіць пра палітыку! Пэўна, мой сябра грыз, грыз сухі хлеб, бо абяцалі лепшы... Таму цяпер на мяне глядзіць, бы я яму спёр лепшы бохан, а пакінуў чэрствыя акрайчыкі? Напіхваў тых акрайчыкаў поўныя запазухі ўсё жыццё, а рабіў від, што поўныя там ды цёплыя бохны носіць...

— Чаго маўчыш? — запытаўся ў мяне ўрэшце мой сябра Коля. — Хоць выпіў бы кілішак яшчэ.

— Ну, — узняў я наш славуты беларускі тост. — Ну, за што п'ем... За нашых!

Тут Мікола завёўся:

— Ты што?! Здраднікам мяне лічыш?! Сядзіш, вось, тут у мяне, грэешся, чарку... гэта самае... Ну, чаго маўчыш! Кажы, што ты пра мяне думаеш! Калі табе разборкі патрэбны!

І сарваў з сябе тыя шоры Мікола, і вату з вушэй павывалакаў, і нос сабе ледзь не адарваў. Ад злосці. На мяне. Хопіць...

Вандал Арлянскі

Мы ёсць цэнтр

Мядзведзь Сандар Жоржавіч меў выключна працавіты дзень. Нават не спазніўся на чарговы сход уселяснога кіраўніцтва, куды трапіў пасля шчырых размоў з прадстаўніком тыгра Садзіка, мядзведжага прыяцеля, правадыра адлеглых пустынных прастораў.

— Я адчуваю сябе вельмі падмацаваным гэтай размовай, — пачаў сход мядзведзь, становячыся на заднія лапы.

— Які ж ён вялікі, — загарэлася румянцам лань Гаўрусіха, якая загаралася так кожны раз, калі Сандар Жоржавіч рабіўся двухногім.

— Наша сяброўства з тыграм квітнее. І ніякі чарвяк пладоў гэтай дружбы не знішчыць, — працягваў мядзведзь. — Ды не дзеля таго мы сёння тут спаткаліся. Хачу вам прадставіць вожыка Джоша, нашага самага выдатнага лясного навукоўца.

Члены сходу, хто як умеў, выказалі задавальненне прыбыццём вожыка. Дзяцел Стукач пастукаў дзюбай у дуб (званы ў гонар Сандара „мядзведжым"), заяц Генадзь затрапятаў, як заўсёды ў падобных сітуацыях, вушамі, Гаўрусіха падскочыла тройчы гучна ламаючы капыткамі раскінутыя па паляне галінкі, дзік Свіналыч захрумкаў пад тыя падскокі. Толькі вавёрка Кацюша скарыстала момант, падвярнула назад галоўку і раскусіла чарговы арэх. На жаль, Сандар заўважыў, што Кацюша выкручваецца ад выражэння радасці. Падышоў да сасны, на якой сядзела, і прасіпеў:

— Вы яшчэ, вавёрка, дагуляецеся! Ну, глядзіце, бо адпраўлю вас на адрэзак лясных спецработ і застануцца вам толькі ягадкі, як таму Беламу Лебедзю з рэдакцыі „Лясное долі", якому таксама здавалася, што я не бачу.

Кацюша спалохалася. Падмяла кіту і выплюнула рэшту смачнага арэха. Мядзведзь вярнуўся на сярэдзіну паляны.

— Аддаю голас нашаму госцю.

— Мы, народ... — пачаў вядомай у іншых лясах фразай наёжаны вожык Джош, што сустрэла шчыры аплаўз лясного кіраўніцтва. — Мы ганарымся нашым самым апошнім адкрыццём (аплаўз). Наш лес распаложаны ў самай сярэдзіне лясного кантынента (авацыя). Наш мядзведзь стаіць, вось, на пупку кантынента (аплаўз і авацыя). Так сказаць, Сандар Жоржавіч ёсць яго пупком (аплаўз і авацыя, якіх не апішаш словам). — Джош уцягнуў калючкі.

— Загадваю разаслаць весткі з гэтай навінай па ўсім свеце, — заявіў мядзведзь. — Перш за ўсё мае аб гэтым даведацца воўк Нятупін з Уладзімірскага лесу. Хай ён не думае, што мы сякія-такія. Мы ж не абыхто. Мы найважнейшыя, мы е самы цэнтр.

І зноў кіраўніцтва, падтрыманае духова, разбрылося па лесе. Сандар Жоржавіч з вожыкам Джошам падаліся ў мядзведжую бярлогу на дыскусію аб стратэгіі цэнтральна распаложанага лесу. Толькі вавёрка Кацюша засталася, здавалася б, у задуме і мроях. Ды так магло толькі здавацца. Азірнулася па апусцелай паляне, саскочыла з сасны. Лапкамі разгрэбла галінкі паламаныя ланінымі падскокамі радасці. Ухапіла рэштку свайго выплюнутага арэха.

— Цэнтр — цэнтрам, адкрыццё — адкрыццём, гонар — гонарам, а арэхі лузаць трэба! — падумала і плітанула глыбока ў лес.

МакХолад

ISSN 0546-1960